Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 196 (5870) | 26 жніўня 1937 г., чацвер | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЕННЯ У НУМАРЫ:

Прыём у Крэмлі экіпажа самалёта «АНТ-25» — Героя Совецкага Саюза тав. Громава і тт. Юмашова і Даніліна — 1 стар.

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Совета Народных Камісараў БССР аб ліквідацыі калгасных судоў — 1 стар.

На пошукі самалёта тав. Леванеўскага: Караблі паветранай экспедыцыі стартавалі на Поўнач. Клопаты вялікага Сталіна аб чалавеку натхняюць нас. Паветраная экспедыцыя ў Архангельску.

АРТЫКУЛЫ:

Перадавы — Большэвіцкае рашэнне арганізацыйных пытанняў.

Куды вядзе маскоўская нарада — 3 стар.

М. Разуменка — У прыёмнай — 2 стар.

Міцура — Белрыбтрэст знішчае рыбную гаспадарку БССР.

Справа вялікай важнасці — 3 стар.

Замест агляду друку — Маўчыць газета. Неадкладна выправіць памылкі, дапушчаныя пры ажыццяўленні пастановы партыі і ўрада — 2 стар. Высокаякасна завяршыць сяўбу азімых да 1 верасня — 2 стар.

ЗА РУБЯЖОМ:

На франтах у Іспаніі. Хваляванні ў тылу мяцежнікаў.

Вайна Японіі супроць кітайскага народу. Сялянскія хваляванні ў Польшчы.

БОЛЬШЭВІЦКАЕ РАШЭННЕ АРГАНІЗАЦЫЙНЫХ ПЫТАННЯЎ

«Пасля таго, як дана правільная лінія, пасля таго, як дано правільнае рашэнне пытання, поспех справы залежыць ад арганізацыйнай работы, ад арганізацыі працьбы за правядзенне ў жыццё лініі партыі, ад правільнага падбору людзей, ад праверкі выканання рашэнняў кіруючых органаў». Так растлумачваў таварыш Сталін на XVII з'ездзе партыі значэнне правільнай арганізацыі кіраўніцтва.

Апублікаваная 23 жніўня пастанова рада аб раздзяленні Народнага камісарыята цяжкай прамысловасці і назначэнне новых кіраўнікоў прамысловасці і транспарту з'яўляецца выдатным узорам практычнага вырашэння арганізацыйных пытанняў у адпаведнасці з новымі палітычнымі задачамі, якія стаяць перад краінай.

Рэарганізацыя Наркамата цяжкай індустрыі і вылучэнне самастойнага Народнага камісарыята машынабудаўніцтва цалам выцякаюць з нашага росту, з ускладнёўшыхся задач гаспадарчага кіраўніцтва а сучасным этапе.

Машынабудаўніцтва не толькі вядучая галіна народнай гаспадаркі, але і серцаціна нашай прамысловасці. У жалкай даваеннай капіталістычнай індустрыі царкай Расіі на долю машынабудаўніцтва прыпадала менш 7 проц. усёй прадукцыі. Гэта лічба — яркі сімвал тэхнічнай адсталасці краіны, забойчы сведка няпольнасці расійскай буржуазіі парваць ланцут яе залежнасці ад замежнага капітала.

За гады совецкай улады, па сутнасці справы за дзве сталінскія пяцігодкі, мы павялічылі прадукцыю машынабудаўніцтва прыблізна ў 30 разоў. **Краіна не мела машынабудаўнічай прамысловасці. Мы стварылі е пад кіраўніцтвам Сталінскага Цэнтральнага Камітэта партыі і совецкага ўрада.**

Валавой прадукцыі ўсёй прамысловасці, асягаючай па плану 1937 г. 103 мільярдаў рублёў, на долю прадукцыі машынабудаўніцтва і металаапрацоўкі прыпадае 0,3 мільярда.

Яшчэ напярэдадні першай сталінскай пяцігодкі ў нас не было ні трактарнай, і аўтамабільнай, ні авіяцыйнай прамысловасці, мы не мелі свайго станкабудаўніцтва, сваёй наладжанай вытворчасці сучасных сельскагаспадарчых машын. Цяпер усё гэта ёсць у нас, і ў такіх памерах, якім могуць пазайздросціць многія буйнейшыя капіталістычныя краіны.

Дастаткова назваць такія прадпрыемствы цяжкага машынабудаўніцтва, як Новакраматорскі завод імя Сталіна, Уралмашзавод імя Орджанікідзе, Харкаўскі турбагенератарны завод імя Сталіна, «Электрасіла» імя Кірава і іншыя, каб запомніць, як далёка мы шагнулі наперад галіне тэхнічнага прагрэсу, якія кадры машынабудаўнікоў створаны ў нас.

Цяпер няма такой машыны, якую нельга было-б пабудаваць на совецкіх заводах рукамі совецкіх людзей. Але зазнаваецца машынабудаўнікам не прыходзіцца. Яны не навучыліся яшчэ скарыстоўваць да дна тую выдатную тэхніку, якой уладаюць. Кіраўнікі не навучыліся спалучаць у сваёй рабоце сапраўды расійскі рэвалюцыйны размах з амерыканскай дзелавітасцю. На першакласных заводах, якія распалагаюць самым сучасным абсталяваннем, часамі пануюць саматужніцтва, прымітыўныя метады работы, людзі «працуюць» над выпускам ужо маральна зношаных машын. Гэтага цярпець зусім нельга.

Аб слабасці кіраўніцтва яскравей за ўсё гаворыць той факт, што ў апошні час галыя галіны нашага машынабудаўніцтва досыць значна адсталі. Будаўнікі паравозаў і вагонаў, сельскагаспадарчых машын і камбайнаў, інструментальшчыкі і станкабудаўнікі, работнікі аўтамабільных і трактарных заводаў дрэнна выконваюць гадавы план. Горш таго: у першым паўгоддзі гэтага года рад галін адступіў ад пазіцый, заваяваных у мінулым годзе.

У галы трэцяй пяцігодкі перад нашым машынабудаўніцтвам стаіць задача дагнаць і перагнаць самыя перадавыя капіталістычныя прадпрыемствы ў тэхнічных адносінах. Але для гэтага неабходна перш за ўсё перамагчы адсталасць нашых заводаў у культуры вытворчасці, у прадукцыйнасці працы, у трываласці машын і старанасці іх аддзелкі. Сур'ёзна трэба падцягнуць і нашу канструктарскую мысль. Машынабудаўнікам і іх наркому тав. В. І. Межлауку ёсць над чым папрацаваць, каб марка совецкай машыны стала лепшай у свеце.

Выключная перспектыва бліскучага ўздыму раскрываецца таксама перад усім калектывам работнікаў цяжкай індустрыі. Вугальшчыкі і нафтавікі, металургі і хімікі, электрыкі і будаўнікі могуць вінішаваць сябе з новым наркомам — Лазарам Майсеевічам Кагановічам — таленавітым кіраўніком, бліскучым майстрам сталінскага стылю работы. Слаўны саратнік таварыша Сталіна прыносіць у цяжкую індустрыю не толькі свой велізарны вопыт партыйнай работы, але і выдатнае веданне складанейшых пытанняў гаспадаркі. Пад яго кіраўніцтвам у гісторыю совецкага транспарту ўпісаны выдатныя старонкі.

Наркамату шляхоў зносін прызіты добрыя традыцыі — яго работа зверху да нізу пранітана большэвіцкай партыйнасцю. Прышоўшы на транспарт у тыя гады, калі чыгуначнікі доўга танталіся на месцы і грузілі па 56 тысяч вагонаў у дзень, таварыш Кагановіч, разграміўшы прадзельшчыкаў і кансерватараў, падняўшы на барацьбу мільёны людзей, здолеў у кароткі тэрмін вывесці транспарт у рады перадавікоў. Цяпер штодзённая нагрузка трымаецца на ўзроўні каля 100 тысяч вагонаў.

Сакрэт гэтых поспехаў у тым, што на транспарце навучыліся ненавідзець ворагаў, труціць нягоднае, бічаваць і выпальваць гнілое. На транспарце навучыліся чула прыслухоўвацца да крытыкі мас, смела высоўваць скромных і добрасумленных работнікаў, зразумелі, нарэшце, што значыць падбор і большэвіцкае выхаванне кадраў. Новаму наркому шляхоў зносін тав. А. В. Бакуліну і ўсёй двухмільённай арміі чыгуначнікаў можна пажадаць, каб яны прадаўжалі слаўныя сталінскія традыцыі, развівалі і множылі перамогі транспарту.

Партыя і ўрад чакаюць сур'ёзнага пералому ў рабоце цяжкай прамысловасці. Няма чаго граха таіць, работнікі цяжкай індустрыі, выхаваныя партыяй і Серго Орджанікідзе ў традыцыі сістэматычнага перавышэння планаў, у апошні час здалі свае пазіцыі. З перадавікоў яны ператварыліся зараз у адстаючых. Між тым выплаўка чыгуну, сталі, каляровых металаў, вытворчасць праката, электраэнергіі, здабыча вугалю, нафты, руды—гэта аснова развіцця ўсёй социялістычнай гаспадаркі. Работнікам цяжкай індустрыі не да твару адставаць.

Уладаючы магутнай тэхнікай, выдатнымі кадрамі нізавых камандзіраў і стаханаўцаў, галіны цяжкай індустрыі ўпусцілі свае першынства толькі таму, што тут прыкметна паслаблена дысцыпліна, парушаны цвёрды большэвіцкі парадак, а кіраўнікі глаўкаў, трэстаў і заводаў праяўляюць разгубленасць перад крытыкай, не змагаюцца энергічна з вынікамі шкодніцтва, не арганізуюць і не ўзначальваюць велізарную ініцыятыву мас.

Цяжкая індустрыя атрымала кіраўніка, які ўпэўнена павядзе яе да новых рашаючых перамог. Ужо самае назначэнне новага наркома выклікала велізарны ўздым на заводах і шахтах. Сотні мітынгаў шлюць гарачыя прывітанні сталінскаму наркому. І самае каштоўнае ў гэтых прывітаннях тое, што буйнейшыя заводскія калектывы і асобныя рабочыя прывітаюць тав. Кагановіча справамі: значным перавышэннем планавых заданняў і перавыкананнем норм выпрацоўкі. Гэта—першыя ластаўкі новай вясны, якая адкрываецца ў цяжкай індустрыі.

Краіна ўправе чакаць дяпер ад усёй арміі работнікаў цяжкай прамысловасці, ад машынабудаўнікоў і чыгуначнікаў не толькі безумоўнага выканання дзяржаўных планаў, але і бліскучага росквіту гэтых рашаючых галін народнай гаспадаркі. Большэвіцкае рашэнне арганізацыйных пытанняў стварыла для гэтага ўсе прадпасылкі.

„Правда“.

ПРЫЁМ У КРЭМЛІ ЭКІПАЖА САМАЛЁТА „АНТ-25“—ГЕРОЯ СОВЕЦКАГА САЮЗА т. ГРОМАВА і тт. ЮМАШОВА і ДАНІЛІНА

23 жніўня ў Вялікім Крэмлёўскім палацы адбыўся прыём Героя Совецкага Саюза тав. Громава і тт. Юмашова і Даніліна, якія бліскуча зрабілі гераічны беспасадачны пералёт Масква — Паўночны полюс — Сан-Джасінто (ЗША) і ўстанавілі сусветны рэкорд дальнасці палёту па прамой. Прыём быў наладжан Цэнтральным Камітэтам ВКП(б) і ўрадам СССР.

У Георгіеўскай залі сабраліся родныя і прыяцелі таварышоў Громава, Юмашова і Даніліна, работнікі авіяцыйнай прамысловасці і іншых арганізацый, якія працавалі непасрэдна па абслугоўванню пералёту, работнікі Галоўпаўночморшляху, стаханаўцы маскоўскіх прадпрыемстваў, шматлікія прадстаўнікі друку і літаратуры, навукі і мастацтва, члены ЦК ВКП(б) і ўрада. Сярод прысутнічаўшых — кіраўнікі ваеннай і грамадзянскай авіяцыі, буйнейшыя авіяканструктары, Героі Совецкага Саюза тт. Шмідт, Вадап'янаў, Молакаў, Шэвелеў, Алексееў, Бабушкін, Спірын, Белякоў, тт. В. І. Межлаук, Рухімовіч, маршал Совецкага Саюза т. Егораў, тт. Хрушчоў, Булганін і іншыя.

Бурнай авацыяй, крыкамі «ура» сустрэлі сабраўшыяся з'яўленне таварышоў Сталіна, Молатава, членаў Палітбюро ЦК ВКП(б) і ўрада. Доўга не змаўкалі захапляючыя воклічы: «Няхай жыве наш вялікі родны Сталін!», «Ура таварышу Сталіну!».

За сталом прэзідыума — таварышы Сталін, Молатаў, Кагановіч, Варашылаў, Калінін, Мікаян, Чубар, Андрэеў, Касіор, Жданаў, Ежоў, Дзімітраў.

Калі за сталом прэзідыума з'яўляюцца тт. Громаў, Юмашоў, Данілін, таварышы Сталін, Молатаў, кіраўнікі партыі і ўрада цёпла і сардэчна абдымаюць кожнага з іх. Зал захапляюча апладыруе.

У часе прыёму начальнік Галоўпаўночморшляху Герой Совецкага Саюза О. Ю. Шмідт абвясціў першы тост у гонар геройскай тройкі—таварышоў Громава, Юмашова і Даніліна, слаўных сыноў вялікага Совецкага Саюза, якія сваім нябачаным пералётам памножылі славу нашай вялікай радзімы. Усе прысутнічаўшыя з велізарным натхненнем і цеплынёй зітэлі герояў-пераможцаў.

Захапляючай, бурнай, працяжнай авацыяй сустракаюць усе прысутныя тост, які тав. Шмідт абвясціў ў гонар арганізатара і натхняльніка ўсіх перамог социялізма, у тым ліку і нябачаных у гісторыі пералётаў праз Паўночны полюс, у гонар вялікага і любімага правадыра народаў таварыша Сталіна.

— Вышэйшае шчасце для верных сыноў совецкага народа, — гаворыць тав. Шмідт, — працуючы на сваім участку, паспяхова выконваць указанні таварыша Сталіна, які натхняе совецкіх людзей на гераічныя справы. Гэта шчасце адчуў экіпаж «АНТ-25». Усе ўстаюць. Велізарная зала агалашаецца велізарнай авацыяй, бурай апладысментаў, воклічамі: «Няхай жыве таварыш Сталін!».

Далей тав. Шмідт абвяшчае тост за бліжэйшага саратніка вялікага Сталіна — главу совецкага ўрада таварыша В. М. Молатава. «Толькі нашай дзяржаве, нашаму ўраду, — гаворыць тав. Шмідт, — пад сілу арганізацыя ў настолькі кароткі тэрмін трох такіх грандыёзных пералётаў». Прысутнічаўшыя стоячы наладжваюць авацыю ў гонар тав. Молатава.

Тав. Шмідт абвяшчае затым тост у гонар старшыні ЦВК СССР тав. М. І. Калініна. Гарачымі авацыямі зала вітае тав. Калініна. І зноў успыхвае гром авацый, калі тав. Шмідт узнімае бакал у гонар баявога наркома абароны маршала Совецкага Саюза таварыша К. Е. Варашылава, у гонар слаўнага сталінскага наркома таварыша Л. М. Кагановіча, у гонар намеснікаў старшыні Соўнаркома таварышоў В. Я. Чубара і А. І. Мікаяна.

Таварыш Варашылаў абвяшчае тост за гераічных сыноў совецкага народа і за лепшых з іх, удастоеных ганаровага звання Героя Совецкага Саюза. Тав. Варашылаў абвяшчае таксама тост за Героя Совецкага Саюза таварыша О. Ю. Шмідта, зала бурна апладыруе.

Тав. О. Ю. Шмідт абвяшчае заключны тост у гонар рабочых і інжынераў, тэхнікаў, канструктароў і кіраўнікоў авіяцыі і авіяцыйнай прамысловасці, у гонар наркома абароннай прамысловасці тав. Рухімовіча, вядомага канструктара раду самалётаў, у тым ліку «АНТ-25», праф. Тупалева, канструктара матораў т. Мікуліна і іншых. Зноў грымяць апладысменты.

Для прысутнічаўшых на прыёме быў дан канцэрт, у якім прымалі ўдзел лепшыя артыстычныя сілы краіны. З вялікім поспехам выступіў чыгуначны ансамбль песні і пляскі. Асаблівы поспех у прысутнічаўшых мелі выступленні Чырвонаармейскага ансамбля чырвонаармейскай песні і пляскі Саюза ССР. (ТАСС).

Народны Камісар Шляхоў Зносін тав. Бакулін Алексей Венідзіктавіч.

АБ ЛІКВІДАЦЫІ КАЛГАСНЫХ СУДОЎ

ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА І СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

У сувязі з тым, што згодна Сталінскага статута сельскагаспадарчай арцелі асноўная частка падсудных калгасным судам спраў належыць вырашэнню ў парадку арт. 17 статута праўленнямі і агульнымі сходамі калгасаў і што тыя катэгорыі падсудных калгасным судам спраў, якія не падлягаюць вырашэнню ў парадку статута сельскагаспадарчай арцелі, разглядаюцца і сельскімі судамі, ЦВК і СНК БССР **пастанаўляюць:**

1. Існуючыя на тэрыторыі БССР калгасныя суды **ліквідаваць.**

Пастанову ЦВК і СНК БССР ад 19 жніўня 1933 года «Аб арганізацыі калгасных судоў» (З. З. БССР 1933 г. № 52, паст. 337) **скасаваць.**

2. Справы былых калгасных судоў, якія не падлягаюць вырашэнню ў парадку арт. 17 статута сельскагаспадарчай арцелі праўленнямі і агульнымі сходамі калгасаў, перадаць грамадскім сельскім і местачковым судам.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР М. СТАКУН.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР Д. ВАЛКОВІЧ.

За сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР — член прэзідыума ЦВК БССР СУРТА.

НА ПОШУКІ САМАЛЕТА тав. ЛЕВАНЕУСКАГА

КАРАБЛІ ПАВЕТРАНАЙ ЭКСПЕДЫЦЫІ СТАРТАВАЛІ НА ПОЎНАЧ

Караблі паветранай экспедыцыі, кіруемай Героем Совецкага Саюза тав. Шэвелевым, гатовы былі вылецець у Арктыку на пошукі экіпажа самалёта «Н-209» яшчэ 24 жніўня. Аднак, цяжкія метэаралагічныя ўмовы на трасе пералёту Масква—Архангельск затрымалі старт. Начальнік экспедыцыі тав. Шэвелеў, параіўшыся з метэаралогамі і камандзірамі караблёў, назначыў старт на 25 жніўня. Па прапановае Героя Совецкага Саюза акадэміка О. Ю. Шмідта вольны час выкарыстаны было скарыстаць для апошніх кантрольных палётаў.

Два разы падымаліся ў паветра ўсе караблі 24 жніўня. Пілоты яшчэ і яшчэ раз правяралі гатоўнасць матэрыяльнай часткі для дальняга рэйса. Маторы, радыёапаратура, электраараванавігацыйнае абсталяванне працавалі бездакорна. Апошнія выпрабавальныя палёты прайшлі бліскуча. Усе тры пяжкія караблі былі запраўлены гаручым і маслам, загружаны паходным снаражэннем і карэспандэнцыяй.

Раніца 25 жніўня выдалася на рэдкасць ясная, ціхая. Ужо на світанні каля пяжкіх машын вазіліся матарысты і механікі. У 6 гадзін 40 мінут былі апрабаваны маторы ўсіх караблёў.

У хуткім часе на Цэнтральны аэрадром імя Фрунзе імкліва накіраваўся паток аўтамашын. Прыбывалі работнікі Галоўпаўночморшляху, лётчыкі, сваякі і блізкія ўдзельнікаў экспедыцыі. Сярод праважаючых — Герой Совецкага Саюза акадэмік О. Ю. Шмідт, Герой Совецкага Саюза тав. Бабушкін, начальнік паліткіраўніцтва Галоўпаўночморшляху тав. Бергавінаў, начальнік штаба пералёту Масква—ЗША палкоўнік тав. Чэкалаў.

Метэаралогі перадалі экіпажу апошнюю зводку надвор'я.

Прыбліжаецца час старта. Зноў заводзяцца маторы. Адзін, другі, трэці, чацверты... Уздрыгвае і ажывае флагманскі карабль. Усё хутчэй і хутчэй варочаюцца яго прапелеры. Вось ужо працуюць маторы і іншых караблёў. Лётчыкі, развітаўшыся са сваякамі і прыяцелямі, накіроўваюцца да машын. Тав. Шмідт дае апошнія напутственныя ўказанні лётчыкам. Дзяўчаты прыпадносяць ім букеты жывых кветак. Фотарэпарцёры і кіноаператары зафіксоўваюць на плёнку карціну гэтых незвычайных цёплых, чуллівых провадаў.

8 гадзін раніцы. Удзельнікі экспедыцыі займаюць свае месцы на самалётах.

Праважаючыя адходзяць у бок. Самалёт «Н-170» павольна, ледзь пакачваючыся, ідзе па дарожцы да месца старта. Праз 5 мінут туды-ж накіроўваецца самалёт «Н-171», а потым — і самалёт «Н-172».

Самалёт «Н-170» спыняецца ля старта. Тав. Вадап'янаў падае знак: «Усё ў парадку!».

У 8 гадзін 25 мінут флагманскі карабль пачынае свой гераічны рэйс. Развіваючы хуткасць, ён бяжыць па бетоннай дарожцы. Праз некалькі секунд адрываецца ад зямлі і ўходзіць у паветра.

Прайшла мінута, і ў паветра падымаецца самалёт «Н-171» Героя Совецкага Саюза тав. Молакава. Яшчэ праз мінуту ў палёт адпраўляецца самалёт «Н-172» Героя Совецкага Саюза тав. Алексеева.

КЛОПАТЫ ВЯЛІКАГА СТАЛІНА АБ ЧАЛАВЕКУ НАТХНЯЮЦЬ НАС

Роўна 2 месяцы назад, 25 чэрвеня, мы вярнуліся ў родную Маскву, паспяхова выканаўшы сталінскае заданне па арганізацыі дрэйфуючай палярнай станцыі на Паўночным полюсе.

Сёння мы зноў падымаем у паветра свае караблі і адпраўляемся ў Арктыку на пошукі экіпажа самалёта «Н-209».

Клопаты нашага любімага правадыра вялікага Сталіна аб чалавеку натхняюць нас. Імя Сталіна напісана на нашым сцягу. З ім мы адпраўляемся ў далёкія, яшчэ неазведаныя раёны па той бок полюса.

Мы не спынімся перад велізарнымі труднасцямі, якія стаяць на нашым шляху. Мы прыкладзем усе свае сілы, усе свае веды, увесь вопыт палярнай авіяцыі для таго, каб вырваць з ледзянога палону нашых таварышоў: Леванеўскага, Кастанаева, Леўчэнка, Пабежымава, Гадавікова і Галкоўскага.

Да хуткага спаткання, прыяцелі і таварышы!

Ад імя экіпажа самалётаў «Н-170», «Н-171», «Н-172»: **героі Совецкага Саюза М. І. ШЭВЕЛЕЎ, М. В. ВАДАП'ЯНАЎ, В. С. МОЛАКАЎ, І. Т. СПІРЫН, А. Д. АЛЕКСЕЕЎ.**

Цэнтральны аэрадром імя Фрунзе.

ПАВЕТРАНАЯ ЭКСПЕДЫЦЫЯ Ў АРХАНГЕЛЬСКУ

Згодна паведамлення з Архангельска, самалёты экспедыцыі Героя Совецкага Саюза тав. Шэвелёва зрабілі пасадку на архангельскім аэрадроме. Самалёт «Н-170» тав. Вадап'янава прызямліўся ў 15 гадзін 20 мінут, самалёт «Н-171» тав. Молакава — у 15 гадзін 27 мінут і самалёт «Н-172» тав. Алексеева — у 15 гадзін 37 мінут. (БЕЛТА).

СКЛАД ЭКСПЕДЫЦЫІ ГЕРОЯ СОВЕЦКАГА САЮЗА тав. ШЭВЕЛЕВА

Паветраная экспедыцыя, вылецеўшая 25 жніўня з Масквы, складаецца з трох самалётаў «АНТ-6», на якіх вясной гэтага года зрабіла пералёт Масква—Паўночны полюс — Масква экспедыцыя Героя Совецкага Саюза тав. О. Ю. Шмідта. Машыны нанава праверены, прайшлі паследуючы рамонт і выпрабаваны ў паветры. Усе яны ў найлепшым становішчы. Апазнавальныя знакі машын: «Н-170», «Н-171» і «Н-172».

Начальнік экспедыцыі Герой Совецкага Саюза тав. М. І. Шэвелеў і флагштурман экспедыцыі Герой Совецкага Саюза тав. І. Т. Спірын знаходзіцца на барту флагманскага карабля «Н-170», якім камандуе начальнік лётнай часткі экспедыцыі Герой Совецкага Саюза тав. М. В. Вадап'янаў. Другі пілот — старшы лейтэнант тав. А. Н. Тягунін, першы бортмеханік—тав. Ф. І. Басейн і другія бортмеханікі—тт. П. П. Пеценін і К. І. Марозаў, бортрадыст — тав. С. А. Іваноў. Апрача таго, на барту самалёта «Н-170» знаходзяцца сіноптык экспедыцыі т. Б. Л. Дзердзееўскі і прадстаўнік авіяцыйнага завода тав. І. Г. Кістанаў.

Другім караблём — «Н-171» — камандуе Герой Совецкага Саюза тав. В. С. Молакаў. Другі пілот на гэтым самалёце — тав. Г. К. Орлоў. Штурманам ляціць тав. А. А. Рытслянд, першым бортмеханікам — тав. В. Л. Іванына і другімі бортмеханікамі — тт. Д. А. Тімафееў і В. Д. Терэнцеў і радыстам — тав. В. В. Ходаў. На барту самалёта «Н-171» ляцяць таксама парторг экспедыцыі тав. А. А. Мітрошкін і кіноаператар тав. Р. Л. Кармен.

Камандзір трэцяга самалёта—«Н-172» — Герой Совецкага Саюза тав. А. Д. Алексееў, другі пілот—капітан тав. А. А. Курбан, штурман — тав. Н. М. Жукаў. У складзе экіпажа — першы бортмеханік тав. К. Н. Сугробаў, другія бортмеханікі—тт. М. І. Чагін і В. Г. Гінкін, радыст тав. О. А. Куксін і прадстаўнікі заводаў тт. К. А. Траскін і С. В. Малікаў.

(БЕЛТА).

ГУТАРКА З ГЕРОЕМ СОВЕЦКАГА САЮЗА тав. А. Д. АЛЕКСЕЕВЫМ

Праз некалькі мінут пасля пасадкі самалётаў «Н-170», «Н-171» і «Н-172» у Архангельску карэспандэнт ТАСС выклікаў к тэлефону на архангельскім аэрадроме камандзіра карабля «Н-172» Героя Совецкага Саюза тав. А. Д. Алексеева.

Тав. Алексееў расказаў аб палёце з Масквы ў Архангельск наступнае:

— Узяўшы старт, мы настроіліся і лягчі курсам на Поўнач. У цэнтры пайшоў самалёт тав. Вадап'янава, злева ад яго — самалёт тав. Молакава, а мой самалёт — справа.

З Масквы да Волагды ляцелі на невялікай вышыні. Затым, прыкладна, каля возера Вожа бачнасць стала дрэннай, і нам прышлося падняцца за воблакі. Часамі ішлі на вышні 2.000 метраў.

Пералёт з Масквы ў Архангельск быў нятрудны. Усе ўдзельнікі экспедыцыі адчуваюць сябе добра. Адразу пасля пасадкі нас запрасілі ў сталовую.

Сёння вечарам збярэмся на нараду ў начальніка экспедыцыі тав. Шэвелёва. Будзем абмяркоўваць план нашага далейшага прасоўвання на Поўнач. Пасля абеда крыху адпачнем і пачнем запраўляць машыны.

Прывітанне Маскве і масквічам.

(БЕЛТА).

АДКРЫЛАСЯ ДРУГАЯ КОМСАМОЛЬСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ КАГАНОВІЦКАГА РАЁНА

Учора вечарам у галоўным корпусе Універсітэцкага гарадка распачала работу другая комсамольская канферэнцыя Кагановіцкага горраёна (Менск).

На канферэнцыі прысутнічаюць 205 дэлегатаў з 232, атрымаўшых мандаты, і 255 дэлегатаў з правам рашаючага голаса, выбраных у пярвічных комсамольскіх арганізацыях. Гэта сведчыць аб недастатковай арганізаванасці і кіруючым уплыве горрайкома комсамола.

На вячэрнім пасяджэнні вырашаны арганізацыйныя пытанні. Канферэнцыя таксама заслухала справаздачу выконваючага абавязкі сакратара райкома комсамола тав. Прохараза аб рабоце райкома.

Сёння канферэнцыя заслухае працяг справаздачнага даклада горрайкома комсамола і распачнуцца спрэчкі.

ФРАНЦУЗСКІЯ ПЕДАГОГІ Ў МЕНСКУ

Гэтымі днямі Менск наведала група французскіх педагогаў з 20 чалавек. Паездка іх у СССР арганізавана лігай асветы Францыі.

Педагогі азнаёміліся з новабудоўлямі сталіцы БССР і наведалі Палац піонераў і акцябрат.

У кнігу запісаў Беларускага аддзялення «Інтурыст» французскія педагогі пакінулі запіс, у якім адзначаюць, што яны асталіся вельмі задаволенымі наведваннем Менска, растучага палітычнага і культурнага цэнтра адной з рэспублік Совецкага Саюза.

НЕАДКЛАДНА ВЫПРАВІЦЬ ПАМЫЛКІ, ДАПУШЧАНЫЯ ПРЫ АЖЫЦЦЯЎЛЕННІ ПАСТАНОВЫ ПАРТЫІ І ЎРАДА

ЗЛАЧЫННАЯ БЕСКЛАПОТНАСЦЬ

Пасля Пленума ЦК КП(б)В, які ўказаў на рад грубейшых скажэнняў, дапушчаных у многіх раёнах БССР па выкананню пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б), гэтыя скажэнні па Чашніцкаму раёну яшчэ не выпраўлены. Паводле справаздачных вестак на 23 жніўня, у раёне лічыцца, што ўсім 861 гаспадаркам вернуты незаконна адрэзаныя прысядзібныя землі.

Аднак, знаёмства са становішчам спраў у сельскіх советах і калгасах паказвае, што яшчэ і зараз зварот калгаснікам незаконна адрэзанай прысядзібнай зямлі не закончан.

Вось факты з Лукомскага сельсовета. Старшыня гэтага сельсовета т. Кісялёў, парторг т. Баркевіч Таццяна імкнуцца даказаць, што па сельсавеце ўсе гаспадаркі, у якіх была незаконна адрэзана прысядзібная зямля, выяўлены і зямля ім вернута. Але пры наведванні калгаса «Прагрэс» высветлілася, што ў калгасніка Галуза Пятра, які карыстаўся прысядзібнай зямлёй у 0,47 га, у свой час былі незаконна адняты 0,07 га прысядзібнай зямлі і гэтая зямля яшчэ яму не вернута.

Калгасніца Ляўшук Каця да 1933 года карысталася прысядзібнай зямлёй у 0,50 га. Пры ўступленні ў калгас ёй была адведзена сядзіба ў 0,25 га, але і зараз незаконна адабраная ад яе прысядзібная зямля не вернута. Калгасніца Чарняўская Полька карыстаецца зараз прысядзібным участкам у 0,25 гектара. Яна скардзіцца, што раней мела большы прысядзібны ўчастак, але ні старшыня сельсовета т. Кісялёў, ні старшыня калгаса т. Шыбека не праверылі, якім яна карысталася прысядзібным участкам, каб вярнуць ёй незаконна аднятую прысядзібную зямлю.

У сельскагаспадарчай арцелі «Шлях Леніна» таксама не выяўлены ўсе калгасныя гаспадаркі, якім трэба вярнуць незаконна адрэзаную прысядзібную зямлю. Старшыня гэтага калгаса тав. Худалей заяўляе, што «зараз гэтай справай займацца няма калі».

Аналагічныя факты выяўляюцца па Слітчанскаму сельсовету, дзе многім калгаснікам сельгасарцелей «Чырвоны араты» і «Чырвоны вугал» таксама яшчэ не вернута незаконна аднятая ў іх у свой час прысядзібная зямля.

Гэтыя факты сведчаць, што ў раёне недапушчальна бесклапотна адносяцца да ажыццяўлення пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) і ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў сельскай гаспадарцы.

Не выкрытыя да канца варожыя прыхвасні, стаўленікі польскіх шпіёнаў, карыстаючыся слабай масавай работай і палітычнай бесклапотнасцю некаторых комуністаў, прабуюць усяк сказіць і скампраметаваць гістарычную пастанову партыі і ўрада.

Гэтымі днямі ў Іванскім сельсавеце быў такі факт. Па волі старшыні гэтага сельсовета Падрэза ў арцелі «Палітаддзелец» справа надзялення калгаснікаў прысядзібнай зямлёй была перададручана праўленню гэтага калгаса і трапіла ў рукі рахункаводу арцелі Александровічу Арцёму. Хто такі Александровіч? Ён сын кулака, яго гаспадарка мела 16 га зямлі, трох коней, 4—5 кароў, наёмную рабочую сілу. Бацька яго судзім і выслан. Сам Александровіч Арцём наспеў пабываць ужо ў двух калгасах і зараз знаходзіцца ў трэцім.

Карыстаючыся бесклапотнасцю старшыні сельсовета Падрэза і праўлення калгаса, Александровіч па свайму ўгледжанню склаў спіс калгаснікаў і вызначыў, як яму спадабалася, колькасць зямлі для павелічэння прысядзібных участкаў кожнай калгаснай гаспадарцы. У выніку здарылася, што частка калгасных двароў, у якіх была незаконна адрэзана прысядзібная зямля, не атрымалі яе, а сам Александровіч — сын кулака — сумеў павялічыць свой прысядзібны ўчастак у два разы, давёўшы яго да 0,50 га.

Аднак, у гэтай справе райком КП(б)Б не ўгледзіў яўна варожага акта і не прыняў па ёй ніякага рашэння. Грубае скажэнне пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) у калгасе «Палітаддзелец» яшчэ не выпраўлена.

Недапушчальная маруднасць адчуваецца ў раёне ў перадачы калгасам зямель ліквідуемых соўгасаў. 1144 гектары соўгаснай зямлі яшчэ не перададзены ў натуры калгасам. Ні аднаго гектара былой соўгаснай зямлі, якая перадана ўжо калгасам, яшчэ не занесена ў акты на вечнае карыстанне. Пры перадачы калгасам зямлі ліквідуемага соўгаса «Абрубы-Чысцік»; побач з устанаўленнем новых слупоў, абазначаючых межы, старыя межавыя знакі адразу-ж не знішчаюцца.

На тэрыторыі раёна ёсць каля 600 га зямлі (сенажаць і часткова зорыва), якою да апошняга часу карысталіся розныя ўстановы і арганізацыі раёна. На гэтую зямлю зусім законна прэтэндуюць навакольныя калгасы, але зараз яшчэ няма канчатковага плана размеркавання гэтай зямлі сярод калгасаў. З 120 калгасаў, якія павінны атрымаць 2500 га лесу, атрымалі апошні ў натуры не больш 10 калгасаў раёна.

Зусім зразумела, што ў Чашніцкім раёне такія скажэнні пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) нельга лічыць выпадковымі. Становішча спраў у раёне, наяўнасць палітычнай бесклапотнасці да выканання гістарычнай пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б), да хутчэйшай ліквідацыі вынікаў шкодніцтва сведчыць, што тут не выкрыты яшчэ ўсе ворагі і іх стаўленікі.

У прыватнасці, прымушаюць звярнуць на сябе ўвагу дзейнасць раённага фінансавага аддзела і яго загадчыка Іванова. Вядома, што рукамі Іванова ў раёне ажыццяўлялася фінансавая палітыка, якая дыктавалася польскімі шпіёнамі, пралезшымі на кіруючыя пасады ў акрузе і раёне. Іваноў па рабоце быў з імі цесна звязан, але і зараз ён не толькі не прадпрымае ўсіх неабходных мер, каб хутчэй выправіць скажэнні, дапускаемыя ў раёне ў фінансавай і падатковай палітыцы, а наадварот, творыць шкодніцкую справу.

Вось факт. Не гледзячы на пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 8 красавіка г. г. аб спісанні нядоімак па грашовых падатках і страхавых плацяжах па становішчу на 1 студзеня 1936 года, Іваноў не аформіў гэтага спісання да апошніх дзён. Толькі гэтымі днямі, калі прайшло ўжо каля 5 месяцаў, у сельскія советы былі разасланы паведамленні аб знятцы нядоімкі па грашовых падатках і страхавых плацяжах. Хіба не ясна, што такія адносіны Іванова да пастановы партыі і ўрада цалкам адлюстроўваюць імкненні польскіх шпіёнаў затармазіць давядзенне гэтай вялікай дапамогі да калгаснага сялянства? Аднак гэты факт не стаў прадметам абмеркавання райкома КП(б)Б. І яго тут прынялі, як за звычайную з'яву.

Як відаць, сакратар РК КП(б)Б тав. Марголін не зрабіў усіх неабходных вывадаў са становішча спраў у раёне, праяўляе незразумелую бесклапотнасць да ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў сельскай гаспадарцы раёна, да канчатковага выкарчоўвання стаўленікаў польскіх шпіёнаў, якія прытаіліся ў арганізацыях і ўстановах раёна.

Н. ПУЗІКАЎ.

Практычна ажыццяўляецца пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб аказанні дапамогі калгаснаму сялянству Беларускай ССР і аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў справе калгаснага ўпарадкавання». НА ЗДЫМКУ: стада калгаса «Новы Хочын», Пухавіцкага раёна, пасецца ў лесе дзяржаўнага значэння, дзе раней пасвіць жывёлу было забаронена. Пад наглядам вопытнага калгаснага пастуха Малышава Нікапая стада знаходзіць у лесе багаты корм. Фото Гнедзько (БСФ).

ВОРАГІ АРУДУЮЦЬ БЕСПАКАРАНА

Кіраўнікі Жыткавіцкага раёна (старшыня РВК Тамілін, загадчык райза Кісялёў) не арганізавалі сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў дэталёвага вывучэння гістарычнай пастановы партыі і ўрада. Горш таго, ва ўстановах — РВК, райза і лесгасе—працуюць прабраўшыяся на адказныя пасады людзі з цёмным мінулым, якія ўсякімі метадамі тармозяць рэалізацыю сталінскага закона.

У райлесгасе часова выконваючым абязкі дырэктара працуе Цырыбка, які быў выключан з партыі за шкодніцтва. Гэты Цырыбка і пасля пастановы партыі і ўрада накладае на калгасы і калгаснікаў штрафы за лесапарушэнне. Калгас «Чырвоны памежнік», Браніслаўскага сельсовета, Цырыбка аштрафаваў у суме 500 руб. і зараз спаганяе іх. Калгаснікі абураны злачыннымі дзеяннямі Цырыбкі.

Дырэктар лесгаса Гуцаў і да гэтага часу не паклапаціўся зняць раней накладзеныя штрафы з калгасаў і калгаснікаў за лесапарушэнне. Толькі за апошні квартал такіх штрафаў было накладзена на калгасы і калгаснікаў 14.870 руб., якія і па сённешні дзень яшчэ не зняты. Работнікі райлесгаса замест зняцця спаганяюць іх.

Лясы і лясныя ўгоддзі ў раёне яшчэ не перададзены ні аднаму калгасу.

Карыстаючыся палітычнай бясклопатнасцю раённых кіраўнікоў, сектанты, «богаугоднікі» і іншая нечысць з трацкісцка-бухарынскай зграі стараюцца адвесці ўвагу калгаснікаў ад пастановы партыі і ўрада. Яны праводзяць сваю варожую прапаганду супроць гэтай пастановы.

Н. КОСАРАЎ.
А. КАСАБУЦКІ.

ЗАЦЯГВАЮЦЬ АДВОД ЛЯСОЎ

Па Асіпавіцкаму раёну адвод лясоў калгасам з выдачай актаў на вечнае карыстанне праводзіцца пакуль што толькі ў Дзерапоўскім, Замоскім, Верайцоўскім і Ясенскім сельсоветах. У астатніх сельсоветах гэта работа недапушчальна зацягваецца.

На адводзе лясоў працуюць толькі 7 землеўпарадчыкаў, якія не спраўляюцца з работай і не забяспечаць да 1 верасня адвод лясоў калгасам.

Кіраўніцтва раёна не мабілізавала на гэту работу спецыялістаў лясной гаспадаркі і ўвесь раённы актыў. Гэта ставіць пад яўную пагрозу зрыву сканчэнне адводу лясоў калгасам у вызначаны партыяй і ўрадам тэрмін.

ТРАЦЗЎСКІ.

НЕ ПРЫМАЮЦЬ У КАЛГАС

127 аднаасобных гаспадарак Уздзенскага раёна з вялікай радасцю сустрэлі пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б), якая прадастаўляе вялікія ільготы для аднаасобных гаспадарак, уступаючых у калгас.

Для зрапрацоўкі гэтай важнейшай пастановы ў кожным сельсавеце праведзены сходы аднаасобнікаў. На сходах высветлілася, што большасць аднаасобнікаў ужо былі ў калгасах, абагулілі сваю маёмасць, але выключаны з іх у розныя часы, пры чым выключаны многія зусім беспадстаўна. Аднаасобнікі жадаюць уступіць у калгасы, бо добра пераканаліся ў тым, што калгасы — адзіны шлях паляпшэння добрабыту селяніна. Дзевяць аднаасобных гаспадарак падалі ўжо заявы аб уступленні ў калгасы.

Але на гэтым шляху чынуцца з раённых кіруючых арганізацый сельсветаў і калгасаў стварылі нямала перашкод. Вось, напрыклад, каваль Махнач Іван з калгаса «Першамайск», Сямёнавіцкага сельсовета. Ён уступіў у калгас у 1932 годзе, абагуліў сваю маёмасць. Праз некаторы час яго адпусцілі на адыходніцтва, а потым за гэта выключылі з калгаса і не дапусцілі яго сям'ю да працы ў калгасе. Колькі ні прасіла жонка Махнача залічыць яе калгаснікай, праўленне калгаса ў просьбах адмаўляла, матывуючы тым, што яе муж знаходзіцца на адыходніцтве.

Такое-ж бесспадстаўнае выключэнне з калгасаў ёсць і ў калгасе «Свабода» гэтага-ж сельсовета, у калгасе «Інтэрнацыянал», Уздзенскага сельсовета, і радзе іншых калгасаў. У гэтым асноўная прычына таго, што больш ста аднаасобных гаспадарак раёна знаходзіцца яшчэ па-за калгасамі.

Я. ІВАШЫН.

КАЛГАС імя ЕЖОВА

Аднаасобнікі вёскі Стараселле, Кулакоўскага сельсовета (Бялыніцкі раён), абмеркаваўшы на сваім агульным сходзе пастанову партыі і ўрада аб аказанні дапамогі калгаснаму сялянству Беларускай ССР, пастанавілі арганізаваць калгас.

— Мы хочам таксама быць актыўнымі змагарамі за вялікую справу Леніна—Сталіна, за пабудову комунізма, — заявілі аднаасобнікі Зязулін Фёдар і Зязулін Матвей.

У калгас уступіла ўжо дзесяць гаспадарак. Свой новы калгас былыя аднаасобнікі вёскі Стараселле назвалі імем тав. Ежова. Новыя калгаснікі знішчаюць межы на палях і рыхтуюцца да сяўбы азімых.

ЧАРНЯК.

ВЫСОКАЯКАСНА ЗАВЯРШЫЦЬ СЯЎБУ АЗІМЫХ ДА 1 ВЕРАСНЯ

ЗРЫВАЕЦЦА СЯЎБА ГАТУНКОВЫМ НАСЕННЕМ

Бягомльскаму раёну згодна пастановы СНК БССР патрэбна засеяць 1150 гектараў гатунковым насеннем жыта «Вятка», якое калгасы раёна павінны атрымаць узамен з Заслаўскага раёна. Урадавы тэрмін сяўбы азімых падыходзіць да канца. Але гатунковае насенне, якое вызначана па плану Бягомльскаму раёну ў колькасці 186 тон, да гэтага часу не атрымана.

Усе калгасы Мсціжскага сельсовета і 5 калгасаў Нідальскага сельсовета да гэтага часу яшчэ не распачалі сяўбы толькі таму, што гэтыя калгасы згодна плана сяўбы азімых павінны правесці сяўбу на 100 проц. гатунковым насеннем, каб у 1938 годзе забяспечыць калгасы раёна гатунковым насеннем. Сяўбу азімых ва ўстаноўленыя тэрміны зрываюць сваёй мядзлежай непаваротлівасцю загадчык райземаддзела т. Скараходкін, старшыня РВК т. Шэмпель і сакратар РК КП(б)Б т. Дэйч.

Праўда, загадчык райземаддзела запэўняе, што ён неаднаразова звяртаўся да намесніка наркома земляробства т. Баранчыка і начальніка жывёлагадоўчага кіраўніцтва т. Міронава, якія адказвалі, што ў бліжэйшыя дні насенне атрымаюць. Загадчык насеннаводчага аддзела Наркамзема БССР т. Загаральскі раіць выехаць загадчыку райземаддзела ў Барысаўскую кантору Заготзярно і папрабаваць атрымаць гатунковае насенне там.

Усе гэтыя недапушчальныя факты гавораць аб прамым шкодніцтве, накіраваным на зрыў важнейшых мерапрыемстваў партыі і ўрада аб павышэнні ўраджайнасці социялістычных палёў.

АНАНІЧ.
ШУРАЎ.

СЯЎБУ ПУСЦІЛІ НА САМАЦЕК

Па раёнах Слуцкай акругі зусім маруднa разгортваецца сяўба азімых. Устаноўленыя партыяй і ўрадам тэрміны злачынна зрываюцца.

У Чырвонаслабодскім раёне толькі асобныя калгасы прыступілі да сяўбы. Напрыклад, у сельгасарцелі «Прамень» засеяна 11 гектараў пшаніцы, «12-годзе Кастрычніцкай рэволюцыі»—20 гектараў. Калгасы Чапліцкага сельсовета павінны засеяць 675 гектараў азімых, з іх 280 гектараў пшаніцы. Аднак дагэтуль сяўба не распачата. У калгасе «Майскі прамень» яшчэ не адрамантавалі сельскагаспадарчы інвентар.

Загадчык Чырвонаслабодскага райземаддзела т. Чэрныш займаецца толькі складаннем зводак, а не арганізацыяй сяўбы у калгасах.

Такое-ж становішча ў Старобінскім і Слуцкім раёнах, дзе сяўба пушчана на самацёк.

У калгасах Слуцкага раёна да сяўбы не падрыхтавана высокаякаснае насенне. Толькі 17 калгасаў з 93 прадставілі ў лабараторыю сваё насенне для праверкі на чыстату і ўсхожасць. Загадчык райземаддзела Валынец тлумачыць гэта тым, што няма намалочанага насення.

Машынатрактарныя станцыі не прыступілі да сяўбы. Дырэктар Кучынскай МТС т. Гурбо толькі спрачаецца з агранамам аб тэрмінах сяўбы, і ў гэты час зрываецца сяўбу ў калгасах.

Усё гэта гаворыць аб тым, што раённыя і акруговыя арганізацыі праяўляюць злачынную бестурботнасць і ставяць сяўбу пад пагрозу зрыву.

Г. СКУЦЭНЯ.

ПРЫЁМНЫЯ ІСПЫТЫ У ВНУ

Заканчваюцца прыёмныя іспыты ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Іспыты гэтага года ў большасці інстытутаў прайшлі арганізавана і далі магчымасць папоўніць вышэйшыя навучальныя ўстановы за лік лепшай часткі нашай моладзі.

Падрыхтоўчая работа да прыёму праведзена, аднак, не ўсюды аднолькава. Так, напрыклад, у Дзяржаўным універсітэце ўжо закончаны прыёмныя іспыты. Тут ужо поўнасцю запоўнены 270 вакантных месц і прынята 16 кандыдатаў. Уноў прынятыя размешчаны па факультэтах і гатовы прыступіць да вучобы.

У педагагічным-жа інстытуце, у інстытутах народнай гаспадаркі і совецкага права прыёмныя іспыты ганебна зацягваюцца. Так, на 480 вакантных месц у педагагічным інстытуце імя Горкага было дапушчана да іспытаў усяго 407 чалавек. З іх залічана ў інстытут усяго каля 200 чалавек. Калі-ж прыгледзіцца да набору на асобныя факультэты, то становішча проста пагражаючае. На літаратурны факультэт, напрыклад, прынята 60 чалавек, а неабходна 90, на гістарычны — 30, а неабходна 60 і г. д. Толькі адзін дашкольны факультэт поўнасцю ўкамплектаван.

Яшчэ больш адчувальней дрэнная падрыхтоўка да прыёму ў інстытуце права. У інстытуце народнай гаспадаркі. У інстытуце совецкага права на 25 жніўня прынята ўсяго 63 чалавекі, а трэба 100. Бесклапотнасць дырэкцыі гэтага інстытута проста недапушчальна. Яна прадаўжаецца і ў апошнія дні.

Амаль правален прыём у інстытут народнай гаспадаркі. Да 25 жніўня ту прынята крыху больш паловы неабходнай колькасці студэнтаў. Ні дырэкцыя ні Дзяржплан не адчуваюць трывогі з зрыў набору ў іх інстытут.

Значна лепш праходзяць іспыты ў Мядыцынскім і Політэхнічным інстытутах.

НА КАЛГАСНЫХ РЫНКАХ

МЕНСК. На калгасных рынках Менска працягваецца ўзмоцнены прыток сельскагаспадарчых прадуктаў. За 20 дзён жніўня ў Менску на рынках прадана 444 цэнтнеры бульбы, 2.109 цэнтнераў гуркоў, 469 цэнтнераў памідораў, 2.400 цэнтнераў яблык і груш, 74.000 літраў малака, 300 цэнтнераў мяса і інш. Прыгарадны калгас «Чырвоны агароднік» прадаў ужо на рынку розных сельскагаспадарчых прадуктаў, галоўным чынам гародніны, на 277.000 руб. 1 мяркуе да канца сезона прадаць прадукцыі яшчэ на 200.000 рублёў.

Знізіліся цэны. Бульба прадаецца па 35 рублёў цэнтнер, памідоры — 150 рублёў, яблыкі — 50 рублёў цэнтнер і т. д.

БАРЫСАЎ. За апошнія тры тыдні цэны на рынку на бульбу зменшыліся ўдвое. Мяса добрай якасці можна купіць па 4—5 руб. кілограм, замест ранейшых 6—7 рублёў. Асабліва многа яблык, іх прадаюць па 50 кап. за кілограм. Усе віды гародніны — гуркі, памідоры, капуста, буракі і інш. — патанелі ў 2—3 разы.

Растуць звароты калгасаў. Калгас «Маяк социялізма» прадаў да 23 жніўня на калгасным рынку 13 тон капусты, 1 тон буракоў, 10 тон памідораў, 7 тон гуркоў, 6 тон морквы і інш. гародніны. Даходы ад продажу на рынку калгасна прадукцыі ўзялі кошт прададня.

Упершыню сёлета на калгасны рынак гародніной вышаў калгас «Чырвоная Беларусь». За першыя дні гандлю гародніной ёй атрымаў 3.000 руб.

У ПРЫЁМНАЙ

У прыёмнай Прэзідыума ЦВК БССР кожны дзень можна бачыць доўтія чаргі людзей. Скаржнікі (як прынята называць тут наведвальнікаў прыёмнай) прыязджаюць у Менск, у ЦВК БССР з усіх канцоў рэспублікі. Прыёмная «аперыруе» велізарнымі людскімі масамі. У мінулым годзе, напрыклад, яе наведала 12.667 чалавек. Апрача таго, прыёмная атрымала 20.470 пісем і скарг працоўных па самых рознастайных пытаннях.

Нам давялося блізка пазнаёміцца з работай прыёмнай Прэзідыума ЦВК БССР. Мы лёгка ўявілі сабе расчараванне скаржніка, бачачага ў гэтай установе апошнюю стадыю сваіх прыгод і мытарстваў.

Цяжка ўстанавіць, колькі скарг знаходзіцца зараз у прыёмнай. На 10 жніўня статыстыка прыёмнай зарэгістравала 1.252 скаргі. З іх звыш 300 паступіла сюды ў канцы 1936 года і ў пачатку бягучага года. Сапраўды гістарычная лаўнасць!

Пераважная большасць скарг, пахаваных у канцылярыях прыёмнай, заслугоўвала самай пільнай увагі і, безумоўна, тэрміновага разбору.

Перад намі заява І. Г. Калесова са Слуцка, паступіўшая ў прыёмную ў ліпені мінулага года. На ёй трэба спыніцца больш падрабязна. Калесоў захварэў вострай формай туберкулёза. Мясцовыя арганізацыі адмовілі яму ў просьбе аб прадастаўленні курортнага лячэння і ён вымушан быў звярнуцца ў Менск. У прыёмнай ЦВК скарга яго праляжала месяц, потым была адаслана ў ЦСПСБ на разгляд. Там яна праваляла больш пяці месяцаў у стале сакратара прэзідыума Гераўкера (з 13 жніўня па 21 лютага), пасля чаго ЦСПСБ паведаміў прыёмную ЦВК, што не можа задаволіць просьбу Калесова «за неіменнем пуцёвак».

Атрымаўшы назад заяву Калесова, прыёмная ЦВК БССР зноў адправіла яе блукаць па бюракратычных закавулках. У канцы свайго пакутлівага і доўгага шляху заява Калесова трапіла ў Наркамздрав БССР. З Наркамздрава ў Слуцк палянела дэпеша з запытаннем у мясцовы райздраў—ці сапраўды Калесоў адчувае патрэбу ў курортным лячэнні. Праз некаторы час з Слуцка прышло эпічнае па форме, але ашаламляючае па зместу паведамленне: «Калесоў яшчэ ў снежні 1936 года скончаўся ад туберкулёза лёгкіх».

Аб гэтым, з раду вон выходзячым факце, выклікаючым пачуццё абурэння і горачы, палічылі за лепшае ўмаўчаць. І бяздушныя чыноўнікі, вінаватыя ў смерці чалавека, асталіся беспакаранымі.

Вось другая, больш свежая, але таксама ляжачая пад спудам заява: 35 аднаасобнікаў вёскі Рэчкі, Ледзянскага сельсовета, Чэрвеньскага раёна, у сваім пісьме скардзяцца, што раённыя кіраўнікі абкладалі іх незаконнымі падаткамі, і за няўплату такавых рабілі із'яцце маемасці, усіх рэчаў хатняга ўжытку, жывёлы, зярна і нават апошняй хаты. Прычым, гэта суправаджалася начнымі налётамі раённых кіраўнікоў на хаты «злосных неплацельшчыкаў» і ўзломам сундукоў. У заключэнне чэрвеньскія аднаасобнікі просяць ЦВК БССР дапамагчы ім вярнуць незаконна із'ятую маемасць, жывёлу і даць магчымасць уступіць у калгас.

Здавалася-б, такі сур'ёзны сігнал павінен быў узбудзіць інтарэс нават у невыпрабаванага ў палітыцы чалавека. Між тым, скарга чэрвеньскіх аднаасобнікаў да гэтага часу не разабрана.

Прыёмная атрымлівала і атрымлівае дзесяткі і сотні аналагічных заяў. Вось аднаасобніца з Мехаўскага раёна Ева Мандрык скардзіцца, што ў яе із'ялі карову і ўсе гаспадарчыя пабудовы за тое, што яна спазнілася на тры дні з уплатай падатку ў размеры 85 рублёў. Кандрат Савік з вёскі Молатава Талачынскага раёна скардзіцца на тое, што яму незаконна налічылі падаткі, із'ялі маемасць і прадалі яе па заніжаных цэнах. Трэба было дапамагчы гэтым людзям, трэба было растлумачыць ім пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб дапамозе калгаснаму сялянству Беларусі, а вінаватых ў скажэннях рэволюцыйнай законнасці пакараць, аднак у ЦВК БССР гэтыя і падобныя ім скаргі пакінулі без адказу.

Ці другі павучальны прыклад. Яшчэ ў красавіку бягучага года ў прыёмную паступіла скарга І. Ф. Лысака—калгаснага стоража з Дукорскага сельсовета, Смілавіцкага раёна. З ім здарылася няшчасце. Ноччу, калі ён стаяў на ахове калгаснага свірна, у вёсцы ўспыхнуў пажар. Яго ўласная хата згарэла да тла. Лысак, выконваючы свой доўг, паста не пакінуў, але пазбавіўся прытулку. Між тым, мясцовыя арганізацыі адмовілі яму ў просьбе прадаставіць лес на пабудову новай хаты. Тады Лысак звярнуўся ў ЦВК БССР. Але тут яго скарга не была нават прачытана.

Пералік скаргаў, пакінутых без адказу, можна прадоўжыць.

Трэба адзначыць, што за апошні час узмацніўся прыток скарг калгаснікаў і аднаасобнікаў, папярэўшых ад шкодніцкай работы зараз выкрытых ворагаў народу. Цяпер кожнаму вядома, што абураючае папіранне рэволюцыйных законаў, здзекі над чэсными калгаснікамі і аднаасобнікамі ўваходзілі ў планы польскіх шпіёнаў, заклятых ворагаў народу, арудуючых да нядаўняга часу і ў апараце ЦВК БССР. І па меншай меры дзіўна пазіцыя некаторых кіруючых работнікаў ЦВК БССР, якія старанна адмахваюцца ад прыняцця дзейсных мер да аднаўлення папранай рэволюцыйнай законнасці.

17 мая Прэзідыум ЦВК СССР, абмяркоўваючы пытанне аб рабоце прыёмнай ЦВК БССР па разгляду скарг працоўных, падверг яе дзейнасць суровай крытыцы. Было вынесена адпаведнае рашэнне. Аднак і праз чатыры месяцы мы не знаходзім тут ніякіх змен.

Парадак разгляду скарг не вытрымлівае ніякай крытыкі. Па два-тры месяцы яны ляжаць непрачытанымі і неразгледжанымі. Пісьмы, паступаючыя ў прыёмную, «сартыруюцца», потым, праляжаўшы ў прыёмнай некаторы час, адсылаюцца ў раённыя ці рэспубліканскія арганізацыі для «рэагавання». Іх заносяць у адпаведны рэестр і лічаць на гэтым сваю місію закончанай. Скаржнік ці зусім не атрымлівае адказу, ні яго супакойваюць ні аб чым не гаворачай бюракратычнай адпіскай. Скаржнікі не могуць дабіцца прызвання да парадку людзей, дапускаючых беззаконні, бо прыёмная не кантралюе выканання прыймаемых па скаргах рашэнняў і самаатойна не рашае ні аднаго пытання.

За апошні час колькасць заляжаўшыхся скарг рэзка пайшла на ўбыль. За якія небудзь 10 дзён прыёмная «разглядзела» каля 800 вельмі сур'ёзных заяў.

А як гэта адбылося? Вельмі проста. Прыёмная аўтаматычна рассылае па розных арганізацыях паступаючыя да яе скаргі працоўных, каб разгрузіцца ад іх. Не мудроная гэта справа.

У ЦВК БССР няма дакладна ўстаноўленага часу прыёму наведвальнікаў. Скаржнікам прыходзіцца дзесяткі раз абівацца парогі яго прыёмнай, каб прымусіць выслухаць сваю просьбу, даведацца аб рэзультаце паданай скаргі. Нам прыходзілася наглядаць у рэдкія гадзіны прыёму, які «прыём» сустракаюць наведвальнікі. Зараз уся работа па прыёму скаржнікаў ускладзена на аднаго чалавека—намесніка загадчыка прыёмнай Аленіцкую. Да яе стала падыходзіць наведвальнік.

— Што ў вас такое?—няўважна запытвае яна яго.

— Скарга. Прачытайце. Я чакаў прыёму дзве гадзіны...

— А аб чым яна?

— А вы прачытайце і будзеце ведаць.

— Нам чытаць няма калі. Вы скажыце аб чым, можа гэта да нас не датычыць.

— Не, іменна да вас,—настойвае наведвальнік.

— Ну, добра, пакіньце. Прыходзьце праз 10 дзён.

Праштурхаўшыся ў прыёмнай некалькі гадзін, наведвальнікі ўходзяць ні з чым. А праз 10 дзён ён зноў з'яўляецца ў прыёмнай. І на гэты раз ён сустракае той-жа бюракратызм, тую-ж сухую педантычнасць у абыходжанні. Скарга яго аказваецца, не толькі не разгледжана, але нават не прачытана.

Каму даверана кіраўніцтва гэтай установай, маючай справу з дзесяткамі і сотнямі жывых людзей, абавязанай падаваць прыклад ажыццяўлення совецкага дэмакратызма на практыцы, прыклад сталінскіх клопатаў аб людзях.

Ворагі народу, стаяўшыя доўгі час ля кіраўніцтва ЦВК БССР, стараліся падсунуць на гэты адказны ўчастак заведамы непадыходзячых людзей. Яны збывалі прыёмную Прэзідыума ЦВК самых нягодных чыноўнікаў, якія ўканец абюракраціліся.

Як гэта не дзіўна, але на чале прыёмнай Прэзідыума ЦВК БССР да гэтага часу стаіць Дубаўцоў. Колькі раз асуджалася яго нягодная практыка, колькі сур'ёзных сігналаў, паступаўшых з раёнаў, глушыў, замазваў гэты чалавек, карыстаўшыйся ўвагай і клопатамі ранейшага кіраўніцтва ЦВК. Аднак Дубаўцоў аставаўся на сваім пасту нават у той час, калі для ўсіх было відавочна, што ён разваліў работу прыёмнай і што далейшае яго «кіраўніцтва» чрэвата яшчэ больш сур'ёзнымі вынікамі.

Да гэтага часу ў прыёмнай працуюць Шнітман — раз'язны інспектар, маральна брудны чалавек, гультай і бюракрат, яўна непрыгодная для такой адказнай работы тав. Аленіцкая.

Тав. Стакун не можа не вялець аб прыведзеных намі фактах, у прыватнасці аб вельмі трывожным становішчы з калгарамі прыёмнай. Аднак, ён не прымае рашучых мер для ўкамплектавання гэтага надзвычай важнага ўчастка совецкай работы моцнымі, здольнымі работнікамі. Гэта, між іншым, датычыць не толькі ла прыёмнай. Апарат ЦВК БССР адчувае патрэбу ў асвяжэнні і аздараўленні.

М. РАЗУМЕНКА.

СПРАВА ВЕЛІЗАРНАЙ ВАЖНАСЦІ

Праект Камісіі Наркамзема Саюза ССР Народнага камісарыята соўгасаў «Аб увядзенні правільных севазваротаў» — большэвіцкая праграма барацьбы за высокі ўраджай соцыялістычных палёў. Беларускі народ бачыць у праекце ўвядзення севазваротаў такое мерапрыемства партыі і ўрада, якое кладзе канец блытаніне і бесгаспадарчасці, праводзімым у шырокім маштабе ворагамі ў сельскай гаспадарцы Беларусі. Вось чаму праект сустрэнут калгасным сялянствам і ўсімі працоўнымі нашай краіны з велізарнейшым уздымам.

Польскія шпіёны, шкоднікі і дыверсанты, прабраўшыся ў партыйныя, совецкія і зямельныя арганізацыі нашай рэспублікі, рабілі ўсё, каб знізіць ураджайнасць соцыялістычных палёў. Яны дазвалі калгасам перапавялічаныя планы сяўбы і тым самым пазбаўлялі іх магчымасці атрымаць правільныя севазвароты.

Усёй гэтай шкодніцкай дзейнасці ворагаў нанесен рашучы ўдар. Саюзны ўрад, Цэнтральны Камітэт нашай партыі і таварыш Сталін выкрылі дзеянні здраднікаў і акалічылі калгаснаму сялянству Беларусі велізарнейшую дапамогу. Пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б) у БССР скарачаецца пасеўная плошча на 300 тыс. гектараў. Беларускае сялянства атрымала поўную магчымасць у найкарацейшы тэрмін навесці парадак на калгасных палях і ўзесці правільныя севазвароты.

Што-ж зроблена ў БССР для ажыццяўлення пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 2 жніўня ў адносінах севазваротаў? Весткі з месц гавораць аб тым, што ў гэтым напрамку ў раёнах работа нават не пачата. У пастанове СНК БССР аб падрыхтоўцы да ўвядзення правільных севазваротаў, апублікаванай намі 24 жніўня, справядліва гаворыцца, што зямельныя органы нічога не зрабілі па распрацоўцы канкрэтных мер па прыняцію і ўвядзенню правільных севазваротаў. Наркамзем БССР і Наркомсоўгасаў прадаўжаюць таптацца на месцы і не прымаюць належных мер па хутчэйшай ліквідацыі знішчэнні шкодніцтва на гэтым важнейшым участку. СНК БССР не ўзяў у свае рукі ператрэтыўнага кіраўніцтва гэтай справай, як ў пастанове СНК СССР і ЦК ВКП(б) гэта ўказвалася, што правільныя севазвароты ў Беларусі павінны быць устаноўлены на працягу года.

Спецыялісты сельскай гаспадаркі: агрономы райземаддзелаў і МТС, навуковыя работнікі сельскагаспадарчых і даследчых інстытутаў, а таксама Акадэмія навук па-сапраўднаму не ўключыліся яшчэ ў практычную работу па дапамозе калгасам у складанні праектаў севазваротаў.

Цэнтральныя і раённыя газеты, на якія ўскладзена вялікая роля ў справе мабілізацыі і арганізацыі мас на шырокае і ўсебаковае абмеркаванне праекта Камісіі Наркамзема і Наркомсоўгасаў БССР, таксама не аддаюць належнай увагі гэтаму пытанню. На сваіх старонках газеты вельмі мала адводзяць месца для выказвання думак і прапаноў калгаснікаў, спецыялістаў сельскай гаспадаркі.

З такім становішчам ні ў якім разе нельга мірыцца. Акруговыя і раённыя партыйныя і совецкія органы павінны неадкладна ўзяцца за большэвіцкую арганізацыю мас на ўсебаковае абмеркаванне праекта аб увядзенні правільных севазваротаў, ведучы рашучую барацьбу з недаацэнкай гэтай важнейшай справы, са спробамі ворагаў сарваць своечасовае ўвядзенне севазваротаў.

Саўнарком БССР абавязаў усе акруговыя і раённыя выканаўчыя камітэты паставіць справу так, каб да 10 верасня распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па складанню севазваротаў у калгасах на аснове праекта камісіі Наркамзема СССР і Наркомсоўгасаў, з улікам меркаванняў і прапаноў калгаснікаў, агранамаў і інш. работнікаў сельскай гаспадаркі.

У дапамогу раёнам згодна пастановы СНК пасылаецца вялікая колькасць агранамаў і навуковых работнікаў. Задача партыйных і совецкіх арганізацый поўнасцю выкарыстаць гэтых спецыялістаў. Трэба ўключыць у гэту справу і ўсіх спецыялістаў сельскай гаспадаркі, працуючых непасрэдна ў раёнах.

Цэнтральныя, акруговыя і раённыя газеты павінны паказаць у гэтым большэвіцкія ўзоры арганізацыі мас на разгортванне шырокага і ўсебаковага абмеркавання праекта, канцэнтруючы ўвагу вакол артыкулаў аб перспектывах развіцця сельскай гаспадаркі калгасаў і раёнаў на аснове ўвядзення правільных севазваротаў.

Увядзенне правільных севазваротаў — праблема велізарнейшай важнасці. Таму задача ўсіх партыйных, совецкіх і зямельных арганізацый па-большэвіцку арганізаваць масы на ажыццяўленне гэтай праблемы.

ЗЛАЧЫННАЯ БЕЗГАСПАДАРЧАСЦЬ

Пяжка апісаць, якая безгаспадарчасць пануе на прыгараднай гаспадарцы менскай прамыслова-кааператыўнай арцелі «Пабеда». Ужо больш як тыдзень выбрыя каля 18 тон гуркоў ляжаць пад адкрытым небам і гніюць. Тыя гуркі, якія засталіся не выбранымі, таксама прышлі ў негодную.

Так на гаспадарцы здарылася і з лубінам. З-за бясклопатнасці кіраўнікоў арцелі лубін не быў своечасова ўбран і ў выніку асыпаўся на полі. Што датычыць будаўніцтва свінарніка і канюшні, дык тут яма ніякага гаспадарчага вока. Будаўніцтва свінарніка лічыцца закончаным, але праца голых сцен нічога няма, будаўніцтва-ж канюшні распачалі... і кінулі. Гніе малатарка пад адкрытым небам і інш.

Старшыня арцелі Новадворац аб гэтым зедае, але не прымае ніякіх мер. Яго «кіраўніцтва» прыгараднай гаспадаркай заключаецца ў арганізацыі п'янак за кошт арцельных сродкаў. Так, было 18 ліпеня, калі Новадворац арганізаваў на прыгараднай гаспадарцы бал.

Фактаў злачынстваў можна было-б прывесці больш, але дастаткова гэтых, каб сказаць, што ў прамыслова-кааперацыйнай арцелі «Пабеда» творацца агідныя справы. Пракуратуры г. Менска трэба неадкладна заняцца гэтай арцеллю.

МОРДАС.

ДА УВАГІ МЕНСКАГА ГОРСОВЕТА

Алзіная ў Менску зубапратэзная майстэрня пастаўлена ў выключна дрэнныя умовы. Памяшканне, дзе яна знаходзіцца, ўпна непрыгоднае і не адпавядае элементарным умовам працы.

Але Менскі горсовет і горздраў палец б палец не ўдарылі, каб стварыць для работнікаў памянёнай майстэрні нармальныя ўмовы для працы. Што датычыць ЦК Саюза Медсанпрацы, то тут праявілі звышчуласць: замест настойлівага патрабавання рамонту майстэрні або прадастаўлення іншага памяшкання, прадстаўнікі ЦК саюза распарадзіліся закрыць майстэрню, і рабочыя, вярнуўшыся з водпуску, не маглі прыступіць да работы. Зараз па настаянню работнікаў майстэрні яна адкрыта, але зноў ніхто не турбуецца аб стварэнні спрыяючых умоў працы.

ЭПШТЭЙН.

НАПЯРЭДАДНІ МІЖНАРОДНАГА ЮНАЦКАГА ДНЯ

МАГІЛЕЎ. У матальным цэху шоўкавай фабрыкі арганізаван скразны комсамольска-маладзёжны агрэгат імя 23 Міжнароднага юнацкага дня. У агрэгаце — 4 брыгады, 36 матальшчыц. Яны паказваюць узоры работы. Пры норме ў 700 маткоў комсамолка-матальшчыца Пашкоўская выпрацоўвае ў змену 950 маткоў, а 21 жніўня яна давяла выпрацоўку да 1.022 маткоў. Комсамолка Новікава дае ў змену 980 маткоў.

Такая-ж брыгада арганізавана і ў прадзільным корпусе фабрыкі.

У гонар Міжнароднага юнацкага дня 5 комсамольцаў фабрыкі адправіліся ў шлюпачны пераход Магілеў—Кіеў. Фабрычная моладзь рыхтуецца да стралковых спаборніцтваў з моладдзю аўтарэмзавода.

З усіх бакоў трыбуны на ст. Негарэлае пры сустрэчы тт. Громава, Юмашова і Данілліна сыпалася шматлікая колькасць жывых кветак. НА ЗДЫМКУ: піонерка прыпадносіць кветкі т. Юмашову.

Фото Я. Салавейчыка.

БЕЛРЫБТРЭСТ ЗНІШЧАЕ РЫБНУЮ ГАСПАДАРКУ БССР

Становішча спраў у Белрыбтрэсце сведчыць аб тым, што тут яшчэ не прыступалі да ліквідацыі вынікаў шкодніцтва, што ў самім апараце трэста вольна дзейнічаюць ворагі.

СНК СССР яшчэ ў 1935 годзе абавязаў СНК БССР вызначыць забаронныя месцы для промыслу рыбы, тэрміны, у якія забараняецца яе лавіць; размер рыб, дапушчаемых к лоўлі, і прадзельныя нормы вылаву асобных парод рыб.

Аднак былы састаў СНК БССР на чале з Галаздедам пакінуў у сіле ранейшыя шкодніцкія пастановы, якія дазвалялі лавіць рыбу без усякіх абмежаванняў. Гэтыя пастановы не скасаваны і зараз Белрыбтрэст іх ахвотна выконвае. Пастановы-ж дазваляюць лавіць рыбу невадамі 10—14 м/м ячэй, якімі вылаўліваецца дробны 3—7-грамавы малёк. Гэта прыводзіць да фактычнага знішчэння рыбнай гаспадаркі БССР. З мэтай зрыву развіцця рыбаводства Белрыбтрэст дазволіў таксама лавіць рыбу ў нярэставі перыяд. У выніку вялікая колькасць ікры пападае ў невады і гіне.

Трэст да гэтага часу не скасаваў сваёй шкодніцкай інструкцыі аб сартыроўцы і ўпакоўцы рыбы. Паводле гэтай інструкцыі, падпісанай намеснікам дырэктара трэста Беляковым, дазваляецца накаплівць на ледніках рыбу некалькі дзён, пасля чаго яна павінна прамывацца ў прэснай вадзе і пакавацца для адпраўкі спажыўцам. Між тым нават неспецыялісту зразумела, што прамываць рыбу трэба адразу-ж пасля лову ў невадзе, бо нясвежую рыбу, пражаўшую хоць некалькі гадзін, прамываць шкодна: паскараецца прапэс псавання рыбы. У гэтай-жа інструкцыі прапанавалася сартыраваць рыбу не па вазе, а па размеру — у сантыметрах.

Полацкі рыбучастак адмовіўся выканаць гэтую інструкцыю і аб сваіх меркаваннях напісаў у трэст, але апошні не згадзіўся яе скасаваць.

У Ветрынскім раёне ёсць рыбная гаспадарка «Павліны». Кожны год улоў тут праводзіўся напярэдадні гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі. У гэтым-жа годзе трэст прапанаваў правесці ўлоў да 1 лістапада, г. зн. пакінуць працоўных без рыбы ў святочныя дні.

У гэтай-жа гаспадарцы знаходзіўся ў зімавалах карп-малёк — 54 тыс. штук. У лютым рыба знянацку пачала гінуць. Была выклікана камісія з Інстытута рыбнай гаспадаркі БССР. Навуковыя супрацоўнікі інстытута гідрахімік **Туміловіч** і рыбавод **Савенка**, якія абследвалі прычыны гібелі карпа-малька, зрабілі па меншай меры дзіўнае заключэнне: «рыба хвалюецца (як далікатна сказана!) ад лішка кісларода ў вадзе».

Дагэтуль вядома было, што на рыбу дрэнна адбіваюцца не лішкі, а недахоп кісларода, а паводле сцвярджэнняў «вучоных» з Інстытута рыбнай-гаспадаркі атрымліваецца наадварот.

Калі-ж была выканана іх прапанова і прыток вады быў зменшан у два разы, карп-малёк пачаў яшчэ больш гінуць. Тады рыбная гаспадарка патрабавала прыслаць другую камісію. Трэст доўга маўчаў і ўрэшце праз 17 дзён прыслаў новага спецыяліста. Да гэтага самі работнікі рыбгаспадаркі пачалі вышукваць метады выратавання рыбы. Пачалі вылаўліваць рыбу з-пад ільду і перасаджваць у нагульны пруд з папярэдняй прамыўкай у 4-проц. саляным растворы. Вопыт удаўся, з 3500 штук, якія былі вылаўлены, загінула толькі 300. Рыбгаспадарка тэрмінова паведаміла аб гэтым дырэктару трэста **Антонаву** і прасіла дазволу на аблоў і перасадку ўсёй рыбы ў другі, чысты пруд. На гэта быў атрыман адмоўны адказ, — трэст забараніў праводзіць перасадку гадавіка. Толькі прыехаўшы новы спецыяліст **Сініцын** выявіў сапраўдную прычыну гібелі малька — ад наяўнасці інфузорыі хілодона—і дазволіў праводзіць перасадку малька ў другі пруд. Але было ўжо позна: з 54 тыс. выратавалі толькі 4081 штуку. Калі-б трэст дазволіў правесці гэту работу раней, адыход быў-бы зусім нязначны.

Ворагі, якія акапаліся ў Белрыбтрэсце і яго сістэме, імкнуцца падарваць калгаснае рыбалоўства і яго эканамічную базу. Асабліва старанна яны праводзяць гэту работу ў пагранічных раёнах. На Ветрынскаму раёну, напрыклад, план улову рыбы вызначан у 1700 цэнтнераў, што складае нагрузку на адзін гектар возера 54 кгр., а па асобных калгасах, як «Окцябр» і калгас імя Косарэва — па 69 кгр. Гэта ў той час, як па даных вывучэння спецыяльнай брыгады прафесароў гадавая прадукцыйнасць возера лічыцца ад 15 да 45 кгр. на адзін га. Такая «лінія» Белрыбтрэста вядзе да драпежніцкага знішчэння рыбных багаццяў і спынення развіцця рыбы.

Яшчэ адзін прыклад. У пастанове Саюзнага Соўнаркома сказана, што рачныя і азёрныя вадаёмы раздзяляюцца на прамысловыя і непрамысловыя. Да апошніх адносяцца вадаёмы, якімі, як правіла, карыстаецца толькі мясцовае насельніцтва для асабістых патрэб. Між тым гэта пастанова ўрада ў БССР груба парушаецца. Сотні рэчак і тысячы азёр непрамысловага характару не аблаўліваюцца Белрыбтрэстам і ў той-жа час у іх не дазволена лавіць і мясцоваму насельніцтву. На адной Полацкай акрузе з 555 азёр толькі 181 эксплаатуецца.

Дырэктар-жа трэста Антонаў чамусьці пакрывае шкодніцкую работу ворагаў народу. Пара ачысціць Белрыбтрэст ад прабраўшыхся туды шкоднікаў.

МІЦУРА.

ЗАМЕСТ АГЛЯДУ ДРУКУ

МАЎЧЫЦЬ ГАЗЕТА

У Чавускім раёне ліквідуюцца два шкодніцка арганізаваныя соўгасы — імя Комінтэрна і «Паўлаўка». Гэта ліквідацыя тут адбывалася своеасабліва. Замест таго, каб зямлю ліквідаванага соўгаса «Паўлаўка» перадаць ваколічным калгасам і перш за ўсё тым, у каго яна была абрэзана шкоднікамі, тут паступілі інакш. Ваколічным калгасам зямлю не далі, а арганізавалі «новы» калгас з рабочых соўгаса.

Як-жа чавуская газета **«Чырвоны сцяг»** (рэдактар т. Беразоўская) аднеслася да гэтага абураючага факта дыскрэдытацыі рашэнняў партыі і ўрада? Замест таго, каб быць на варце і весці рашучую барацьбу за правільнае і няўхільнае правядзенне ў жыццё гэтага важнейшага гістарычнага дакумента — сталінскіх клопатаў аб беларускім народзе — захавала дзіўны нейтралітэт.

Не ўмяшалася газета нават пасля спецыяльнага ўказання ЦК КП(б)Б, асудзіўшага шкодную практыку чавускіх кіраўнікоў.

Тым часам вораг выкарыстаў гэта становішча і пачаў праводзіць сваю контрэволюцыйную работу.

Так, напрыклад, адзеўшы на сябе маску рабочага, паследыш выкрытых шпіёнаў Свінцоў адкрыта выступіў супроць ліквідацыі шкодніцка арганізаванага соўгаса, узводзячы яўна контрэволюцыйны паклёп на партыю і ўрад.

Сігналы ў рэдакцыю газеты «Калгасны сцяг» аб гэтым былі, але рэдактар Беразоўская асталася «вернай сабе», прытрымліваючыся свайго ранейшага прынцыпу — не выкрываць ворагаў, моў, гэта справа адпаведных арганізацый.

Няправільна сябе вядзе газета. Яна не толькі не мае права быць нейтральнай. Большэвіцкая газета павінна змагацца за своечасовае і дакладнае выкананне пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 2 жніўня 1937 года.

***

Прыкладу чавускай газеты следуюць плешчаніцкая раённая газета **«Барацьбіт за калектывізацыю»**, клічаўская раённая газета **«Сталінскі шлях»**, рагачоўская раённая газета **«Комунар»** і інш.

Узяць хоць-бы, скажам, камплект клічаўскай газеты з 5 жніўня да сёмішнята дня. Можна смела сказаць, што яна аналагічна чавускай газеце не вядзе рашучай барацьбы за паспяховае выкананне рашэнняў партыі і ўрада.

«Звязда» у артыкуле «Хто кіруе Клічаўскім раёнам?» пісала, што па заданню шпіёнаў, прабраўшыхся на кіруючыя пасты БССР, ворагі народу ў Клічаве тварылі сваю гнусную контрэволюцыйную работу. Аднак, гэта нічаму, відавочна, не навучыла ЧВА рэдактара т. Голуба.

У Клічаве марудна ідзе ліквідацыя чатырох шкодніцка арганізаваных соўгасаў і перадача іх зямель калгасам. Газета праходзіць міма гэтага, не бачыць у гэтай «маруднасці» спробы ворага скампраметаваць рашэнне партыі і ўрада.

Газета не паказвае на сваіх старонках, як выконваецца пастанова ў адносінах ліквідацыі соўгасаў. «Сталінскі шлях» не падхапіла велізарнейшы ўздым калгасных мас, не стала на чале гэтага ўздыму а, наадварот, сваім маўчаннем прыглушала яго.

Райком павінен разабрацца ў прычынах такога дзіўнага маўчання раённай газеты

***

Не лепш вядзе барацьбу за няўхільнае выкананне рашэнняў партыі і ўрада рагачоўская газета «Комунар», рэдактарам якой з'яўляецца т. Балакіраў.

У Рагачове падлягае ліквідацыі шкодніка арганізаваны соўгас «Красніцы». Чаго прасней, узброіўшыся гістарычным рашэннем СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва на Беларусі, прыступіць да ліквідацыі гэтага соўгаса. Аднак, вораг, апрануўшы новую лічыну, падказаў раённым арганізацыям сваё «талкаванне» гэтага рашэння і не без поспеху.

У Рагачове, замест таго, каб зямлю ліквідуемага соўгаса вярнуць калгасу, арганізавалі на зямлі соўгаса новы калгас. Газета супроць гэтага абураючага факта скажэння пастановы не выступіла, не раскрытыкавала такую шкодную практыку правядзення ў жыццё гэтай пастановы.

Больш таго, газета і яе рэдактар т. Балакіраў, маючы сігналы ЦК КП(б)Б аб тым, што калгасная зямля, на якой быў шкодніцка арганізаваны соўгас, злачынна марудна варочаецца калгасу, не патрабавала ад раённых арганізацый больш быстрага выканання рашэння СНК СССР і ЦК ВКП(б) і не ўскрыла «арганізатараў» ілжэкалгаса. Пара-бы газеце навучыцца за фактамі і прычынамі бачыць людзей. Зусім слаба вядзе газета на сваіх старонках і растлумачальную работу па выкананню гістарычнага рашэння партыі і ўрада, не дапамагае працоўным раёна хутчэй ліквідаваць вынікі шкодніцтва.

***

Рэдактар чавускай газеты т. Беразоўская, рэдактар клічаўскай газеты т. Голуб і рагачоўскай газеты т. Балакіраў забылі аб сваім пярвейшым абавязку—пастомна на старонках газеты весці растлумачальную, прапагандысцкую і арганізуючую работу вакол важнейшага рашэння партыі і ўрада па ліквідацыі вынікаў шкодніцтва.

ГОМЕЛЬСКІ ГОРСОВЕТ ІГНАРУЕ ПРОМКААПЕРАЦЫЮ

У Гомелі па віне горсовета разбураюцца буйныя прамысловыя арцелі. Так, спыніла работу арцель «Пабеда», якая павінна была выпусціць у гэтым годзе тавараў на 4 мільёны рублёў. Арцель «Комунар», якая выпускае на 1,5 мільёна рублёў галантарэйных вырабаў, змяшчаецца ў выключнай цеснаце.

На ўсе звароты арцелей аб дазволе папырыць пэхі намеснік старшыні горсовета Крэчмер і загадчык комунгаса Хайкін даюць адзін адказ: «Планам рэканструкцыі горада не прадугледжана размяшчэнне арцелей у тых кварталах, дзе яны існуюць». Горсовет нічога не зрабіў, каб забяспечыць буйнейшым арцелям магчымасць расшырэння, пабудовы патрэбных памяшканняў і т. д.

Працоўнае насельніцтва горада адчувае вялікую патрэбу ў наладжванні рамонту кватэр. Арцель «Стройбытрамонт», якая магла-б наладзіць такое абслугоўванне, з-за бюракратычных адносін горсовета не мае нават памяшкання для канторы, куды-б маглі звяртацца працоўныя, якім патрэбен рамонт.

Адносіны Крэчмера і Хайкіна да разгляду жыццёвых пытанняў промарцелей ідуць яўна ўразрэз з указаннямі партыі і ўрада аб увазе промкааперацыі.

МАЛЕНКОВІЧ, КАРМОЎ і інш.

(ідзе 11 подпісаў).

АДПАЧЫНАК РАБОЧЫХ-АБУТНІКАЎ

Рабочыя абутковай прамысловасці БССР у гэтым годзе асабліва добра праводзяць свой чарговы водпуск. 116 рабочых адпачывалі ў санаторыях Крыма, Каўказа, Украіны. Ініцыятар стаханаўскага руху сярод абутнікаў БССР, абцяжчык тав. Г. Скабло правёў свой водпуск у Гаграх. Вядомы стаханавец фабрыкі імя Кагановіча т. Фельдман адпачываў у Кіславодску. 2379 чалавек атрымалі пуцёўкі ў дамы адпачынку і санаторыі Менска, Віцебска, Гомеля. Усе пуцёўкі былі выданы бясплатна.

Частка стаханаўцаў выкарыстала свой адпочынак для экскурсіі ў Маскву, дзе яны азнаёміліся з работай буйнейшых прадпрыемстваў сталіцы. Група дзяцей рабочых-абутнікаў знаходзіцца цяпер на экскурсіі ў Крыму.

Профсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі абутковай прамысловасці БССР у бягучым годзе выдаткавалі на правядзенне адпачынку рабочых да 600 тыс. руб.

КУДЫ ВЯДЗЕ МАСКОЎСКАЯ НАРАДА

З гэтага нумара мы прыступаем да асвятлення на старонках газеты важнейшых гістарычных падзей, якія адбываліся напярэдадні Кастрычніцкай рэволюцыі. Сёння мы друкуем перадавы артыкул ЦО нашай партыі, напісаны таварышам Сталіным з поваду склікання Маскоўскай Дзяржаўнай Нарады.

Дзяржаўная Нарада была склікана ў Маскве 12 жніўня (па ст. стылю). Яна ўяўляла сабой зпёт усіх контррэволюцыйных сіл для барацьбы супроць рэволюцыі.

На гэтай Нарадзе было прадстаўлена: 488 членаў Дзяржаўных Дум чатырох скліканняў, 129 членаў — ад Гарадскіх Дум, 150 чл. — гандлёва-прамысловых колаў і банкаў, 127 чл. ад арміі і флота, 118 чл. — ад земстваў, 24 чл.—ад духавенства і т. д. Прадстаўнікі Советаў не былі дапушчаны на Дзяржаўную Нараду. Ад імя Советаў на Нарадзе фігуравала дэлегацыя ЦВК, складзеная з меншавікоў і эсэраў, старанна ачышчаная ад большэвікоў.

Меншавікі і эсэры, прасмыкаючыся перад буржуазіяй, актыўна ўдзельнічалі ў змове контррэволюцыі супроць народа.

Адносіны нашай партыі да Дзяржаўнай Нарады выражаны ў рэзалюцыі ЦК па гэтаму пытанню.

У рэзалюцыі гаворыцца:

«ЦК РСДРП прапануе партыйным арганізацыям: па-першае, выкрываць склікаемую ў Маскве нараду, як орган змовы контррэволюцыйнай буржуазіі супроць рэволюцыі; па-другое, выкрываць контррэволюцыйную палітыку эсэраў і меншавікоў, падтрымліваючых гэту нараду; па-трэцяе, арганізаваць масавыя пратэсты рабочых, сялян і салдат супроць нарады.

Уцяканне з Петраграда. Маскоўская Нарада адкрылася. Адкрылася яна не ў Петраградзе, не ў цэнтры рэволюцыі, а падалей ад яго, у «маскоўскай цішыні» У дні рэволюцыі важныя нарады склікаліся, звычайна, у Петраградзе, у цытадэлі рэволюцыі, скінуўшай царызм. Тады Петраграда не баяліся, тады льнулі да яго. Але цяпер дні рэволюцыі змяніліся змрокамі контррэволюцыі. Цяпер Петраград небяспечны, цяпер яго баяцца як чумы і... уцякаюць ад яго, як чэрці ад ладана, падалей, у Маскву, «дзе не так непакойна», дзе, па думцы контррэволюцыянераў, лягчэй за ўсё рабіць свае чорныя справы.

Нарада пойдзе пад снягам Масквы маскоўскія ідэі, маскоўскія настроі далёкі ад гнілога Петраграда—язвы, заражаючай Расію («Веч. Вр.» 11 жніўня).

Так гавораць контррэволюцыянеры З імі зусім згодны «абаронцы».

— У Маскву, у Маскву!—шэпчуцца «выратавальнікі краіны», уцякаючы з Петраграда.

— «Скатертью дорога»,—адказвае ім рэволюцыйны Петраград.

— Байкот вашай Нарадзе,—кідаюць ім наўздагон петраградскія рабочыя.

А Масква? Ці апраўдае яна надзеі контррэволюцыянераў?

Штосьці не падобна на гэта. Газеты поўны паведамленняў аб агульнай забастоўцы ў Маскве. Забастоўка абвешчана маскоўскімі рабочымі. Рабочыя Масквы, як і піцерскія, байкатуюць Нараду. Масква не адстае ад Петраграда.

Няхай жывуць маскоўскія рабочыя!

Што-ж, зноў уцякаць?

З Петраграда ў Маскву, а з Масквы—куды?

Можа быць, у Царэвакакшайск?

Дрэнныя, дрэнныя справы паноў вярсальцаў...

***

Ад Нарады да «доўгага парламента» Падрыхтоўваючы Маскоўскую Нараду, пп. «выратавальнікі» рабілі выгляд, што склікаюць «простую нараду», нічога не рашаючую, ні да чаго не абавязваючую. Але «простая нарада» па-крыху стала ператварацца ў «дзяржаўную», потым у «земскі сабор», а цяпер выразна гавораць аб ператварэнні нарады ў «доўгі парламент», рашаючы важнейшыя пытанні нашага жыцця.

Калі на Маскоўскай Нарадзе,—гаворыць атаман терскага казачага войска Караулаў, — не выкрышталізуецца цэнтр аб'яднання краіны, то будучыня Расіі рысуецца ў сумных танах. Думаю аднак, што такі цэнтр будзе створан... і калі... такі апорны пункт выявіцца, то Маскоўская Нарада аказацца не толькі жыццёвым органам але мае шансы на вельмі доўгае і яркае існаванне, накшталт «доўгага парламента» ў эпоху Кромвеля. Са свайго боку, я як прадстаўнік казацтва пастараюся ўсімі мерамі садзейнічаць стварэнню такога яднаючага цэнтра («Русск. В.» веч. 11 жніўня).

Так гаворыць «прадстаўнік казацтва». Маскоўская Нарада як «цэнтр яднання» контррэволюцыі — такі кароткі сэнс доўгай прамовы Караулава.

Тое-ж самае гаворыць данское казацтва ў наказе сваім прадстаўнікам:

«Урад павінен быць арганізаваны Маскоўскай Нарадай або часовым камітэтам Дзярж. Думы, а не якой-небудзь партыяй, як гэта было да гэтага часу. Такому ўраду павінна быць праластаўлена ўся паўната ўлады і незалежнасці».

Так гаворыць вайсковы круг данскога казацтва. А каму цяпер невядома, што «казакі — гэта сіла»?

Сумненні немагчымы: або Нарада не адбудзецца, або яна адбудзецца — і тады яна немінуча ператворыцца ў «доўгі парламент» контррэволюцыі.

Меншавікі і эсэры, склікаўшыя Нараду, аблегчылі справу арганізацыі контррэволюцыі, усёроўна — хацелі яны гэтага ці не.

Такі факт.

***

Хто яны? Хто яны, гэтыя варапілы контррэволюцыі?

Гэта—перш за ўсё ваеншчына, вярхі каманднага складу, якія вядуць за сабой паўныя колы казацтва і георгіеўскіх кавалераў.

Гэта, па-другое, наша прамысловая буржуазія з Рабушынскім на чале, з тым самым Рабушынскім, які пагражае народу «голадам» і «галечай», калі ён не адмовіцца ад сваіх патрабаванняў.

Гэта, нарэшце, партыя Мілюкова, яднаючая генералаў і прамыслоўцаў супроць рускага народу, супроць рэволюцыі.

Усё гэта дастаткова высветлілася на папярэдняй нарадзе генералаў, прамыслоўцаў і кадэтаў 9—10 жніўня.

***

Ва ўсіх на вуснах імя ген. Карнілова, — піша «Биржевка».—**Дамінуючы ўплыў на нарадзе маюць прадстаўнікі так званай ваеннай партыі на чале з ген. Алексеевым і дэлегаты казачага саюза.** Прамова ген. Алексеева, сказаная на першым пасяджэнні і спатканая нарадай бурнымі выражэннямі адабрэння, будзе паўторана на Маскоўскай Дзяржаўнай Нарадзе («Веч. Бирж.» 11 жніўня).

Гэта тая самая прамова, якую Мілюкоў прапанаваў выдаць у выглядзе асобнага лістка.

Далей:

Вялікую ўвагу выклікае да сябе ген. Каледзін. Да яго асабліва прыглядаюцца і прыслухоўваюцца. Вакол яго групуецца ўся ваенная частка («Веч. Время» 11 жніўня).

Нарэшце, усім вядомы ультыматумы георгіеўскіх кавалераў і казачых саюзаў, узначальваемых тымі-ж скінутымі і яшчэ не скінутымі генераламі.

Прычым ультыматумы выконваюцца неадкладна. Бо ваенныя не любяць «марна балбатаць».

Сумненні немагчымы:

Справа ідзе да запвярджэння і афармлення ваеннай дыктатуры.

Айчынная і саюзная буржуазія будзе яе «толькі» фінансаваць.

Недарма так «цікавіцца парадай сэр Б'юкенен» (гл. «Биржевку»), які, здаецца, таксама збіраецца паехаць у Маскву.

Недарма таржаствуюць маладыя пп Мілюковы.

Недарма адчувае сябе Рабушынскі Мініным, выратоўзаючым і інш.

***

Чаго яны хочуць? Яны хочуць поўнага таржаства контррэволюцыі. Выслухайце рэзалюцыю папярэдняй нарады:

«Няхай у войсках будзе адноўлена дысцыпліна і ўлада пяройдзе да камандна-га складу».

Інакш гаворачы: абуздай салдат!

«Няхай цэнтральная ўлада, адзіная і моцная, пакончыць з сістэмай безадказнага гаспадарання калегіяльных устаноў».

Інакш гаворачы: далоў Советы Рабочых і Сялян!

Няхай урад «рашуча парве з усімі слядамі залежнасці ад якіх-бы там ні было камітэтаў, советаў і іншых падобных арганізацый».

Інакш гаворачы: няхай урад залежыць толькі ад «советаў» казакаў і «канферэнтаў» георгіеўскіх кавалераў.

Рэзалюцыя запэўнае, што толькі такім шляхам можа быць «выратавана Расія».

Здаецца, ясна.

Ну, што-ж, паны згоднікі, згодны вы наладзіць згоду з прадстаўнікамі «жывых сіл»?

Або, можа быць, раздумалі?

Няшчасныя згоднікі...

***

Голас Масквы. А Масква робіць сваю рэволюцыйную справу. Газеты паведамляюць, што па закліку большэвікоў у Маскве пачалася ўжо агульная забастоўка, наперакор рашэнню Ўсерасійскага Выканаўчага Камітэта, які да гэтага часу пятнецца ў хвасце за ворагамі народа

Ганьба Выканаўчаму Камітэту!

Няхай жыве рэволюцыйны пролетарыят Масквы!

Няхай мацней раздасца голас нашых таварышоў у Маскве на радасць усім прыгнечаным і падняволеным.

Няхай даведаецца ўся Расія, што ёсць яшчэ на свеце людзі, гатовыя грудзьмі адстойваць справу рэволюцыі.

Масква бастуе. Няхай жыве Масква!

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

22 жніўня мяцежнікі ўзарвалі ў раёне Каса дэль Кампо 4 будынкі паміж пазіцыямі рэспубліканцаў і мяцежнікаў. 23 жніўня мяцежнікі прабавалі атакаваць раён, які прылягае да месца ўзрыву, аднак, вымушаны былі адступіць на зыходныя пазіцыі.

УСХОДНІ (АРАГОНСКІ) ФРОНТ

22 жніўня ў сектары Альмудэвар (на паўднёвы захад ад Уэскі) чуваць была перастрэлка ў лагеры мяцежнікаў.

23 жніўня мяцежнікі атакавалі пазіцыі рэспубліканцаў каля высаты 697 у сектары Уэскі, але былі адкінуты.

На арагонскім фронце, асабліва ў раёне Бельчытэ (на паўднёвы ўсход ад Сарагосы) наглядаецца моцная канцэнтрацыя войск мяцежнікаў.

ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ

23 жніўня рэспубліканцы адбілі атакі мяцежнікаў, падтрыманыя вялікай колькасцю танкаў. Некалькі танкаў мяцежнікаў знішчана. Пасля неаднаразовых спроб атакаваць пазіцыі рэспубліканцаў, мяцежнікі вымушаны былі адступіць на зыходныя пазіцыі.

Рэспубліканцы аказваюць яраснае супраціўленне часцям мяцежнікаў, падтрыманым авіяцыяй. Па загаду камандавання рэспубліканскія войскі зрабілі стратэгічны адход, які дазволіў ім заняць больш спрыяльныя пазіцыі.

На сантандэрскім фронце ў паветраным баі з рэспубліканскімі самалётамі збіт трохматорны германскі самалёт. Два лётчыкі выкінуліся на парашутах, трэці ўзят у палон.

Тры вёскі ў раёне Сантандэра разбураны авіяцыяй мяцежнікаў, хоць пазбаўлены ўсякага ваеннага значэння. Сярод насельніцтва гэтых вёсак шмат афяр.

ДЗЕЯННІ АВІЯЦЫІ

23 жніўня рэспубліканскія самалёты выявілі за 5 міль ад берага, каля Бланес (на паўночны ўсход ад Барселоны), і прымусілі уцякаць гідрасамалёт мяцежнікаў. Два рэспубліканскія знішчальнікі ўступілі ў бой з двума гідрасамалётамі мяцежнікаў паміж Мальграт і Арэніс дэ Мар (на паўночны усход аб Барселоны), прыблізна за 14 міль ад берага. Самалёты мяцежнікаў удаліліся.

23 жніўня па сантандэрскім фронце матарызаваная калона рэспубліканцаў падвергласа бамбардыроўцы самалётаў мяцежнікаў. Знішчальнікі, суправаджаўшыя калону, уступілі ў бой.

Гэтыя-ж знішчальнікі вытрымалі яшчэ адзін бой з самалётамі мяцежнікаў. Два рэспубліканскія знішчальнікі збіты. Лётчыкі выкінуліся на парашутах. Адзін удала прызямліўся, другі разбіўся, бо не раскрыўся парашут.

23 жніўня самалёты мяцежнікаў прабавалі зрабіць налёты на Картахену, Валенсію і Сагунто, але адагнаны агнём зенітных рэспубліканскіх батарэй.

ХВАЛЯВАННІ Ў ТЫЛУ МЯЦЕЖНІКАЎ

ВАЛЕНСІЯ, 23 жніўня. (БЕЛТА). Міністэрства абароны паведамляе аб новых хваляваннях у тылу мяцежнікаў. Так, сёння раніцою фашысты абстрэльвалі Грэнаду. Фашысцкая авіяцыя скінула над Грэнадай некалькі бомб. Усю раніцу цягнулася артылерыйская і вінтовачная перастрэлка.

* * *

Хваляванні сярод мяцежнікаў у Толедо прадаўжаюцца. 22 жніўня была чуваць адбываўшаяся ў горадзе стральба і разрывы ручных гранат.

23 жніўня відаць быў накіраваны супроць Грэнады артылерыйскі агонь з батарэй мяцежнікаў. У той-жа час была чуваць інтэнсіўная вінтовачна-кулямётная стральба на блізкіх да Грэнады пунктах. Артылерыя мяцежнікаў страляла па вёсцы Арнілья за 4 кілометры на поўдзень ад Грэнады і па аэрадрому. Два самалёты мяцежнікаў бамбардыравалі Альбалотэ за 8 кілометраў на поўнач ад Грэнады.

* * *

ВАЛЕНСІЯ, 24 жніўня. (БЕЛТА). Сёння раніцою рэспубліканцы пачалі наступленне на ўсходнім (арагонскім) фронце, заняўшы гарадок Осэра (30 кілометраў на паўднёвы ўсход ад Сарагосы), перайшлі раку Эбро, занялі чыгуначную станцыю Піна (на поўдзень ад Осэра) і перарэзалі шасэ паміж Бельчытэ і Медыяна (на поўдзень ад Сарагосы).

(БЕЛТА).

АДСТАЎКА ГЕРМАНСКАГА ПАСЛА ПРЫ ШТАБЕ ФРАНКО

БЕРЛІН, 23 жніўня. (БЕЛТА). Згодна паведамлення германскага інфармацыйнага бюро, германскі «пасол» пры «ўрадзе» Франко генерал Фаупель падаў у адстаўку. Адстаўка матывуецца «становішчам здароўя».

АДНОСІНЫ ЗША ДА СТАНОВІШЧА НА ДАЛЁКІМ УСХОДЗЕ

ВАШЫНГТОН, 23 жніўня. (БЕЛТА). Дзяржаўны дэпартамент ЗША апублікаваў заяву аб адносінах ЗША да становішча на Далёкім Усходзе.

У заяве гаворыцца: «Умовы, у якіх працякаюць япона-кітайскія падзеі, маюць прамыя адносіны да агульных прынцыпаў, якія былі сфармуляваны ў заяве ад 16 ліпеня, выклікаўшай адабрэнне больш 50 урадаў. Калі ў якой-небудзь частцы свету ёсць небяспека ўзнікнення сур'ёзных варожых дзеянняў, то тэта павінна стаць прадметам клопатаў усіх народаў. Урад ЗША заклікае бакі ўстрымацца ад вайны і ўладзіць свае рознагалассі ў адпаведнасці з прынцыпамі, якія, на думку не толькі народа ЗША, але і большасці краін, павінны служыць асновай для міжнародных узаемаадносін».

20 жніўня 6 дзяўчат — удзельніц шлюпачнага пераходу Ленінград—Херсон прыбылі ў Гомель. Яны праплылі ўжо 2280 клм. і за гэты час правялі рад гутарак з калгаснікамі аб дапамозе, якую партыя і ўрад аказваюць калгасам Беларускай ССР, аб слаўных нашых пагранічніках, аб метадах работы замежных разведак. НА ЗДЫМКУ: удзельніцы пераходу вывучаюць па карце свой далейшы маршрут на Херсон.

Фото Седзінкіна і Соркіна (БСФ).

СЯЛЯНСКІЯ ХВАЛЯВАННІ Ў ПОЛЬШЧЫ

Масавыя расстрэлы сялян

ПРАГА, 24 жніўня. (БЕЛТА). Як паведамляецца, у Польшчы адбываюцца сялянскія хваляванні. Варшаўскі карэспандэнт чэхаславацкай газеты «Вечер» паведамляе аб масавых расстрэлах сялян — удзельнікаў забастоўкі. Толькі ў Яраслаўскім павеце забіта 17 сялян, у Бохніі і Бжозоўскім паветах — 4, у Ліманоўскім павеце і Ланцуце — 7. У Малапольскім павеце ў вёсках Глазове і Ржэшове забіта 25, ранена 20 чалавек. Усяго ў Малапольскім павеце забіта — 61. У Бохніі пахаванне забітых паліцыяй сялян ператварылася ў многатысячную дэманстрацыю працоўных супроць фашысцкага рэжыму ў Польшчы. 23 жніўня рабочыя горада Бохніі аб'явілі забастоўку салідарнасці з сялянамі, якія ўзняліся на барацьбу.

ЛОНДАН, 23 жніўня. (БЕЛТА). Варшаўскі карэспандэнт «Манчэстэр гардыен», падрабязна паведамляючы аб масавых сялянскіх хваляваннях у Польшчы, піша, што ў Яраслаўскім павеце (Львоўскае ваяводства) некалькі тысяч сялян, якія прымаюць удзел за ўсеагульнай забастоўцы, напалі на паліцэйскае кіраўніцтва і прабавалі захапіць склады зброі. Паліцэйскімі карнымі атрадамі забіта і ранена шмат сялян. Толькі ў адным Яраславе 21 жніўня забіта 10 сялян і тры паліцэйскіх. Сутычкі сялян з паліцыяй адбываліся ў радзе пунктаў на поўдні Польшчы і ў Кракаўскім ваяводстве.

У гэтых сутычках сяляне праяўляюць незвычайную смеласць. Тысячы сялян хаваюцца ў лясах, пагражаючы адтуль новымі выступленнямі.

Забастоўкі салідарнасці

ЛОНДАН, 24 жніўня. (БЕЛТА). Варшаўскі карэспандэнт «Ньюс кронікл» паведамляе аб буйных сутычках паміж паліцыяй і сялянамі ў паветах паўднёвай Польшчы. У Касінцы ў рэзультаце сутычак забіта і ранена шмат сялян.

Тысячы сялян, узброеных косамі, віламі, тапарамі і сярпамі, займаюць дарогі к гарадам і перашкаджаюць прывозу тулы сельскагаспадарчых прадуктаў. Ва многіх гарадах Польшчы рабочыя пачалі забастоўкі салідарнасці з сялянамі.

БАРАЦЬБА ГАРНЯКОЎ ЗА ПАЛЕПШАННЕ ЖЫЦЦЁВЫХ УМОЎ

ВАРШАВА, 23 жніўня. (БЕЛТА). З'езд дэлегатаў гарнякоў Верхняй Сілезіі, які адбыўся ўчора ў Катовіцах, прыняў рэзалюцыю, у якой гаворыцца, што гарнякі гатовы неадкладна пачаць забастоўку ў выпадку, калі не будуць задаволены іх патрабаванні аб павышэнні заработнай платы на 20 процантаў і аб аднаўленні расторгнутых прадпрыемцамі калектыўных дагавораў з прафесіянальнымі саюзамі гарнякоў.

З'езд катэгарычна пратэстуе супроць незадавальнення патрабавання рабочых аб увядзенні 6-гадзіннага рабочага дня. «З'езд папярэджвае совет міністраў, указваецца далей у рэзалюцыі, што гарнякі не спыняць барацьбы, пакуль не будзе ўведзен 6-гадзінны рабочы дзень без зніжэння заработнай платы».

Адначасова з'езд у сваёй рэзалюцыі рашуча асудзіў штрэйкбрэхерскія паводзіны той групы профсаюзных лідэраў, якія, імкнучыся да фашысцкага «лагера нацыянальнага аб'яднання» палкоўніка Копа, прабуюць раскалоць адзінства гарнякоў Верхняй Сілезіі.

ВАЙНА ЯПОНІІ СУПРОЦЬ КІТАЙСКАГА НАРОДА

БАІ Ў ШАНХАІ

ГОРАД АХОПЛЕН ПАЖАРАМІ

ШАНХАЙ, 23 жніўня. (БЕЛТА). У гадзіну ночы 22 жніўня кітайскія войскі ў раёне Хонк'ю пачалі атаку японскіх пазіцый у момант, калі японскія ваенныя судны бамбардыравалі крэпасць Усун. Кітайскія войскі прасунуліся і ўвайшлі ў кантакт са сваёй цэнтральнай калонай. Японскія войскі, размешчаныя на трох вуліцах, таксама займаючыя казармы ў гэтым раёне, акружаны.

22 жніўня раён Путун быў падвергнут артылерыйскаму абстрэлу японскіх ваенных караблёў і паветранай бамбардыроўцы. Увесь раён ваенных дзеянняў ахвачан пажарамі. Учора горад гарэў адначасова ў 7 месцах.

* * *

ШАНХАЙ, 23 жніўня. (БЕЛТА). Сёння ў цэнтры міжнароднага сетльмента на Нанкін-Род узрывам снарада разбуран буйнейшы магазін, які належыць замежнай кампаніі. Забіта звыш 100, ранена звыш 200. Праз 5 мінут другі снарад папаў у склады амерыканскага морскага дэсанта, якія знаходзяцца на тэрыторыі сетльмента. Снарад не ўзарваўся. Згодна заявы кітайскіх улад, папярэдняе даследаванне снарада паказвае, што ён—японскага паходжання.

ВЫСАДКА ЯПОНСКІХ ПАДМАЦАВАННЯЎ

ЛОНДАН, 23 жніўня. (БЕЛТА). Прадстаўнік японскага камандвання ў Шанхаі паведаміў карэспандэнту Рэйтэр, што звыш 50 тысяч японскіх войск высадзілася ў Шанхай-Усунскім раёне.

АФІЦЫЯЛЬНЫЯ ЯПОНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

ТОКІО, 23 жніўня. (БЕЛТА). На Ляпсянскім фронце (Бэйпін-Ханькоуская чыгунка), згодна афіцыяльных японскіх паведамленняў, японцы цаной вялікіх страт 22 жніўня занялі горныя пазіцыі за 30 кілометраў на захад ад Ляпсяна.

Па Цяньцзінь-Пукоускай чыгунцы, на поўдзень ад Тулючэня, японскія войскі занялі Цзіліпу.

Пазіцыі на перавале Нанькоу па-ранейшаму ў руках кітайцаў. Для аслаблення тылу кітайскіх пазіцый у Нанькоу японская авіяцыя зноў бамбардыравала рад гарадоў удоўж Бэйпінь-Суйюаньскай чыгункі. З аперацыямі пад Нанькоу звязаны і дзеянні часцей квантунскай арміі.

РАНЕННЕ АМЕРЫКАНСКІХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ

Н'Ю-ЁРК, 23 жніўня. (БЕЛТА). Згодна паведамлення Асашыйтэд прэс з Шанхая, асколкам артылерыйскага снарада, які ўзарваўся ў міжнародным сетльменце, ранены два карэспандэнты амерыканскай газеты «Н'ю-Ёрк Таймс».

АНГЛА-ФРАНКА-АМЕРЫКАНСКІ ПРАТЭСТ

ЛОНДАН, 23 жніўня. (БЕЛТА). Згодна паведамлення агенцтва Рэйтэр, камандуючыя англійскімі, французскімі і амерыканскімі сіламі ў Шанхаі паслалі сумесны рашучы пратэст японскім марскім уладам супроць таго, што японскія ваенныя судны, якія абстрэльваюць кітайскія пазіцыі, знаходзяцца ў непасрэднай блізкасці да месц якарнай стаянкі замежных ваенных караблёў.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

Ніжэйпералічаныя, выключаныя з партыі пры праверцы і абмене партдакументаў, выклікаюцца на выязную тройку КПК пры ЦК ВКП(б) па БССР на 29 жніўня: Федарэнчык І. М., Вараб'ёў А. П., Патаповіч Ф. В., Столін Б. Г. (**Пухавічы**); Кавалёў Б. С., Уліновіч Д. Т., Усава А. Д., Бехман Н. К., Смалякоў П. Н., Жураўлёў Н. А., Веловіч В. Н., Ціхаміраў А. Н., Васьковіч Е. Н. (**Полацк**); Крэпкін П. Г., Дабравольскі В. Д., Фрэйдлін М. Н. (**Прапойск**); Давідзенка С. І., Науменка А. Л., Бліц І. В., Гаўрыленка П. І., Валетаў З. В., Хайне З. І., Голубаў А. Г., Бараш П. С., Чэрнышэй І. М. (**Рэчыца**); Фамін З. С., Маянц Г. М., Свойскі А. І., Марысаеў К. А., (**Рагачоў**); Ільмовіч Ф. У. (**Сянно**); Арцюхоўскі Н. М., Кузняцоў М. С. (**Смалявічы**); Бычэня П. Н., Палічанскі С. М., Шэўчанка В. Г. (**Старобін**); Варшо Ф. М., Науменка П. М., Забела В. Г., Пузікаў І. С. (**Сіроціна**); Паленкоў Г. П. (**Старыя Дарогі**); Гарбузаў С. У., Маліноўскі В. І., Церэшчанка А. К., Малкіна Л. Г. (**Свяцілавічы**); Герасенка В. С., Малаеў М. С. (**Церахоўна**); Мідзюк Ю. Г., Еўменаў М. К. (**Талочын**); Патоцкі Е. В., Казарын А. Н., Навіцкі І. М. (**Узда**); Ермольчанка І. М., Жыліцкі І. Р. (**Уваравічы**); Сыцік К. Г., Камадзей В. С., Ільюшэнка Н. П. (**Халопенічы**); Мокін Е. Т., Віктарэнка М. Т., Ізуцкіевр Р. А., Шчарбакоў І. П. (**Чавусы**); Лашкевіч А. Ф. (**Чачэрск**); Зубараў Г. П., Паянкоў П. Е. (**Чэрыкаў**); Чэкатоўскі А. В. (**Чэрвень**); Рашчэнка А. І., Багун М. М., Позняк І. І., Піваварaў П. Т., Харкевіч Н. І., Нікіпін І. У., Параў М. Л., Аладзьеў А. С. (**Чашнікі**); Гвяздзёва Е. В., Сямёнаў Г. М., Скарабагаты І. П., Чумакоў Д. Г., Паборцаў М. Т., Харытонаў В. Д., Валасевіч Н. А., Зубкевіч Е. В., Ільін Ф. В., Кармеліцкі Я. І., Матэха І. С., Матвееў П. І., Суслоў Д. І., Сабічэў П. Г. (**Шклоў**); Букатаў Д. М. (**Ветка**); Барысёнак М. В. (**Лёзна**); Даніленка М. С. (**Хоцімск**); Каплан М. Г., Кукалеў Т. У. (**Нарычы**); Малахоўскі А. Ф. (**Расоны**); Гаўрылевіч (**Бягомль**); Барчак С. П., Кардун А. Я. (**Петрыкаў**); Белінскі (**Віцебск**); Федотаў І. В. (**Масква**); Сідзельнік А. Г. (**Тураў**); Чмыхаў К. А., Стумбар Э. І., (**Сураж**); Шэўчук А. Ф., Цульяновіч А. А. (**Слуцк**); Паўроз П. Ф., Науменка М. С. (**Лоеў**); Жыгальскі, Пятроўскі П. М. (**Мсціслаўль**); Дубнель Д. А. (**Ветрына**); Сібенкоў Н. М. (**Чырвонапопле**); Пучкоў Л. І. (**Круглае**); Кауфман А. М. (**Гомель**); Дастанька Ф. В., Юхновіч М. Я. (**Менск**); Меламед А. І. (**Бабруйск**).

—О—

АД ЖЛОБІНСКАГА РК КП(б)Б

Жлобінскі РК КП(б)Б просіць т. Вуса Якава Нікалаевіча з'явіцца ў райком або паведаміць свой дакладны адрас і месца працы. Асоб, ведаючых месца работы тав. Вуса Якава Нікалаевіча, просім паведаміць Жлобінскаму РК КП(б)Б.

Сакратар Жлобінскага РК КП(б)Б. ЧАРНЫШОЎ.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

СЁННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО:

Памяшканне Бел. дзярж. драм. тэатра (т. 24-905)
Гастролі Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР
А. М. Горкі.
ДЗЕЦІ СОНЦА
П'еса ў 4 карц.

Гукавы кінотэатр «Чырвоная зорка»
НА ПАЎНОЧНЫМ ПОЛЮСЕ
На летняй эстрадзе —канцэртнае аддз.

Дзіцячы гукавы кінотэатр ЦУДОЎНЫ КАРАБЕЛЬ

Гукавы кінотэатр «Пролетарый»
НА ДАЛЁКІМ УСХОДЗЕ
На летняй эстрадзе —канцэртнае аддз.

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал»
СЫН РЫБАКА

Гукавы кінотэатр «Спартак»
ПЕЦЕРБУРГСКАЯ НОЧ

ДЗЯРЖЦЫРК
Парк імя Горкага (тэл. 22-725)
ПЕРШЫЯ ГАСТРОЛІ музыкальных эксцэнтрыкі
МУРАТАВА І ТАРКАЧОЎ
3 ШКОЛІНІ акрабаты
4 СОКАЛ крафт-жанглёры
Апошнія гастролі
7 МОРЭНО Футбол па веласіпедах
І шмат іншых нумароў.
Пачатак у 9 г. вечара. Каса адкрыта з 10—2 і з 5—10 гадз. вечара.

Дзяржстрах С.С.С.Р.

Кіраўніцтва Дзяржстраха БССР
праз раённыя і гарадскія страхавыя інспекцыі, а таксама праз агентаў ДЗЯРЖСТРАХА
ПРЫМАЕ ДОБРАВОЛЬНАЕ СТРАХАВАННЕ
МАЕМАСЦІ Ў ЛЮБОЙ СУМЕ У ПРАДЗЕЛАХ ЯЕ САПРАЎДНАГА КОШТУ.
НАРКАМФІН САЮЗА ССР ПАНІЗІЎ ТАРЫФНЫЯ СТАЎКІ ПА СТРАХАВАННЮ ХАТНЯЯ МАЕМАСЦІ
Застрахаваўшы сваю маемасць калгас і кожны грамадзянін гарантуе яе аднаўленне за кошт сродкаў Дзяржстраха ў выпадку гібелі ад стыхійных няшчасцяў.
Калгасы могуць страхаваць
коней, кароў, свіней, авечак і пчол, будынкі, абсталяванне, інвентар і інш. маемасць, а таксама пасевы сельскагаспадарчых культур і сады.
НАРКАМФІН САЮЗА ССР ПАНІЗІЎ ТАРЫФНЫЯ СТАЎКІ ПА СТРАХАВАННЮ ХАТНЯЙ МАЕМАСЦІ
КАЛГАСНІКІ, РАБОЧЫЯ, СЛУЖАЧЫЯ, АДНААСОБНІКІ і іншыя грамадзяне
МОГУЦЬ СТРАХАВАЦЬ ХАТНЮЮ МАЕМАСЦЬ І ЖЫВЁЛУ.
Пры заключэнні страхавання прадастаўляецца растэрміноўка плацяжу і выдаецца ўстаноўленай формы квіт Дзяржстраха.
ДЗЯРЖСТРАХ БССР.

Кінотэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
АНОНС!
ПЕТР ПЕРШЫ



КАЛГАСЫ! КАЛГАСНІКІ! АДНААСОБНІКІ!
ЗДАВАЙЦЕ ПТУШКУ
— У РАХУНАК —
МЯСАПАСТАВАК
У ЖНІЎНІ і ВЕРАСНІ МЕСЯЦАХ, як выключэнне, ДАЗВОЛЕНА прымаць у мясапастаўкі КУР з вагою кожнай галавы АД 800 ГРАМАЎ (замест 1000 грамаў).
ГУСІ прымаюцца вагою не ніжэй 35 00 грамаў;
КАЧКІ — не ніжэй 1400 грамаў;
ІНДЗЕЙКІ — не ніжэй 2800 грамаў.
Паскорце выканэнне сваіх МЯСААБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ.
Здаваць птушку ў рахунак мясаабавязацельстваў ВЕЛЬМІ ВЫГАДНА
Кожныя 700 грамаў здадзенай птушкі залічваецца за 1 кілограм мясапаставак.
БЕЛПТУШКАПРОМ.

ДА ЎВАГІ ВЫВУЧАЮЧЫХ замежныя мовы
ЕСЦЬ у ПРОДАЖЫ
новыя падручнікі:
М. ГЕОРГІЎ
Падручнік французскай мовы.
Цана ў пер. 4 р. 60 к.
Рэкамендаван метадбюро па замежных мовах пры аддзеле рабочай моладзі ЦК ВЛКСМ для груп, курсаў і школ на прадпрыемствах.
Г. ПУРВЕР
Падручнік англійскай мовы для дарослых.
Цана ў пер. 2 р. 60 к.
СІНТАКСІС НЯМЕЦКАЙ МОВЫ. Каган і Гермут, выданне 1937 г.
Цана 2 р. 50 к.
ПРАДАЮЦЦА ВА ЎСІХ КНІЖНЫХ МАГАЗІНАХ.
У ВЫПАДКУ АДСУТНАСЦІ КНІГ НА МЕСЦАХ З ЗАКАЗАМІ ЗВЯРТАЦЦА: Москва, Издательство иностранных рабочих в СССР, ул. 25 Октября, 7, Торготдел.
Падручнікі пасылаюцца наложаным плацяжом без задатку.
Выдаткі па перасылцы за кошт выдавецтва.

ПАТРАБУЮЦЦА
для работы ў Менску:
ІНЖЫНЕР-ЛЕСАВОД,
СТАРШЫЯ САДОЎНІКІ,
БУХГАЛТАР-КАРТАТЭТЧЫК,
ПРАДАЎШЧЫЦЫ КВЕТАК
з латкоў.
Звяртацца: Менск, вул. Карла Маркса, 60 тэл. 24-231, Трэст зялёнага будаўніцтва.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТРУ ОПЕРЫ І БАЛЕТА
ПАТРЭБНЫ ПАКОІ
для артыстаў
Плата па згодзе.
З прапановамі звяртацца па адрасу: Урыцкага, 13/15, тэл. 21-834.

МЕНГАРАНА
абвяшчае ПРЫЁМ
у вячэрнюю школу непісьменных і малапісьменных падростка ў (ад 14 да 18 гадоў), якая дае падрыхтоўку ў аб'ёме 4-гадовай па чатковай школы.
Просьба да фабзаўмясцкомаў і камітэтаў комсамола прадпрыемстваў і ўстаноў і праўленняў арцеляў накіраваць непісьменных і малапісьменных падросткаў у школу.
Запіс у школу пачынаецца 23 жніўня з 7 да 9 гадзін вечара ў памяшканні 6-й дзённай школы (Совецкая, 52).
МЕНГАРАНА.

Уп. Галоўлітбела № 1755. Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая, 63. К., Б., Б.